ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧАЦВЕР, 27 КАСТРЫЧНІКА 1938 г. № 59 (401)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ЛЕДАКОЛ „СЕДОЎ“

Капітану БАДЗІГІНУ
Парторгу ТРАФІМАВУ

У гадавіну дрэйфа шлём вам і ўсяму экіпажу „Седова“ гарачае прывітанне. Упэўнены, што з бальшэвіцкай цвёрдасцю савецкіх людзей вы пераможаце ўсе цяжкасці на вашым шляху і вернецеся на радзіму пераможцамі.

Цiснем вашы рукі, таварышы!

По даручэнню ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР

І. Сталін **В. Молатаў**

ТЭАТР ВЯЛІКАГА СОВЕЦКАГА НАРОДА

Маскоўскаму ордэна Леніна Мастацкаму Акадэмічнаму тэатру імя Горкага споўнілася сорак год. Гэта—свята ўсяго савецкага мастацтва. У скарбніцы культуры вялікага рускага народа МХАТ займае ганаровае месца прагрэсіўнага тэатра, які на працягу ўсяго свайго існавання ішоў па шляху рэалістычнага мастацтва, сцэнічнымі сродкамі ствараючы спектаклі глыбокай мастацкай праўды, а гэта значыць — жыццёвай праўды, без якой мастацтва немагчыма. У юнацкія годы свайго існавання Мастацкі тэатр, не глядзячы на змрочны рэакцыйны царызм і нават некаторы заняпад рускага тэатра, усё-ж застаўся верны шчэпкінскім традыцыям сцэнічнага рэалізма. Гэта зразумела чаму. Таму што МХАТ, арганізаваны вялікімі майстрамі сцэнічнага мастацтва К. С Станіслаўскім і В. І. Неміровічам-Данчэнка, сабраў і аб'яднаў вакол сябе лепшых прадстаўнікоў перадавой інтэлігенцыі 90-х гадоў, адчуваўшай, што патрэбна барацьба за новае жыццё.

Ужо ў пачатку заснавання тэатра акторы і кіраўнікі новаарганізаванага калектыва лічылі, што МХАТ павінен быць народным тэатрам. Ужо ў той час яны імкнуліся наблізіцца да завадскага і фабрычнага гледача, што было забаронена царскай цэнзурай. Фармулюючы задачы новаарганізаванай трупы, К. С. Станіслаўскі на першай рэпетыцыі ў сяле Пушкіне сказаў:

«... Не забывайце, што мы імкнемся асвятліць цёмнае жыццё людзей беднага класа, даць ім шчаслівыя эстэтычныя мінуты сярод той цемры, якая пакрыла іх. Мы імкнемся ствараць першы разумны нраўственны, агульнадаступны тэатр і гэтай высокай мэце мы прысвячаем сваё жыццё».

У гэтым і заслуга тэатра, што ён жыў думамі дэмакратычных слаёў насельніцтва Расіі канца XIX і пачатку XX стагоддзя і паказваў свайму гледачу сапраўднае жыццё з усімі хібамі і выгодамі.

Таму так часта наведваў гэты тэатр і любіў яго вялікі правадыр народа Уладзімір Ільіч Ленін. У ранніх сваіх пісьмах да сваякоў Уладзімір Ільіч цікавіўся адносна новай п'есы А. П. Чэхава «Тры сястры» і прасіў, каб яму паведамілі, што гэта за новы твор.

І гэты тэатр нельга не любіць. Яго любіў А. П. Чэхаў, А. М. Горкі, а зараз любіць і паважае ўвесь савецкі народ шматнацыянальнай краіны соцыялізма. Вялікі пісьменнік А. М. Горкі захапляўся Мастацкім тэатрам і ацэньваў актораў і ўвесь тэатр надзвычай высока. Выдатны пісьменнік бачыў сапраўды «слаўны тэатр», які вырашаў у сваіх спектаклях складаныя пытанні чалавечага жыцця. Тэатр да кожнай сваёй новай работы адносіўся чэсна, творча, з вялікай адказнасцю. Праяўляючы вялікія патрабаванні да драматургіі, МХАТ як у сучасных, так і ў класічных творах імкнуўся гістарычна і рэалістычна правільна вырашаць свае спектаклі.

Упартай працай дамагаўся МХАТ таго адзінага творчага рэалістычнага метада, які ўвайшоў у гісторыю нашага савецкага тэатра як мхатаўскі метад работы над спектаклем. Стыль ігры актораў МХАТ'а вызначаецца тым, што ў іх выкананні відаць сапраўдная прастата, яснасць і празрыстасць вобразаў, высокаідэйная накіраванасць, што ўласціва стылю соцыялістычнага мастацтва.

К. С. Станіслаўскі і В. І. Неміровіч-Данчэнка ўзрасцілі слаўную плеяду майстроў рускай сцэны — Масквіна, Леанідава, Качалава, Кніпер-Чэхаву, Тарханава, Хмелева, Тарасаву і многіх іншых выдатных артыстаў нашага часу.

МХАТ не замыкаўся ў рамкі свайго мастацтва. Ён з кожным сваім новым спектаклем рос і рухаўся наперад, таму што ўзбагачаўся праўдай жыцця, яе перадавымі соцыяльнымі ідэямі і пачуццямі. На сцэне гэтага тэатра з'явіліся творы лепшых рускіх пісьменнікаў—Гогаля, Пушкіна, А. К. Талстога, Л. Талстога, Астроўскага, Салтыкова-Шчадрына, Тургенева, а таксама, заходнееўрапейскіх класікаў—Шэкспіра, Мальера, Байрана, Бомаршэ, Гальдоні і інш.

Мастацкі тэатр заўсёды імкнуўся да актуальнай драматургіі, таму ў яго рэпертуары знаходзілі месца творы сучасных яму пісьменнікаў — А. П. Чэхава і А. М. Горкага.

П'есы Чэхава былі насычаны жыццёвай праўдай. А. М. Горкі прынёс у тэатр творы, якія хвалявалі гледача сваёй палітычнай мэтанакіраванасцю і актуальнасцю тэматыкі. Яго высокамастацкія творы былі тымі буравеснікамі, якія заклікалі працоўны народ да барацьбы за новае жыццё, за светлую будучыню, якая заваявана рабочымі ў саюзе з працоўным сялянствам пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў у кастрычніку 1917 года.

Нарэшце, мары свабодалюбівых народаў і дэмакратычных прадстаўнікоў рускага мастацтва і мастацтва іншых народаў, у мінулым прыгнечаных царызмам, адзейсніліся. З'явіўся той глядач, аб якім мхатаўцы марылі ў пачатку арганізацыі сваёй трупы і для якога яны стваралі свае спектаклі. Акторы МХАТ'а бачылі, што ў савецкай краіне мастацтва і народ непадзельны. Мастацтва ствараецца для народа і яно павінна быць народным, паколькі адлюстроўвае думкі і пачуцці гэтага народа. Рэпертуар тэатра ўзбагаціўся актуальнымі п'есамі Горкага, Трэнева, Вс. Іванова, Катаева, Карнейчука, Вірты і інш. Яго трупа папоўнілася маладымі савецкімі акторамі.

МХАТ быў і застаецца тэатрам, які адгукаецца на актуальныя тэмы сённяшняга дня. Ён сваім мастацтвам дапамагае шчаслівай радзіме ў яе барацьбе з ворагамі народа, якія перашкаджаюць народу будаваць шчаслівае свабоднае жыццё; ён паказвае, як павінен жыць чалавек новага соцыялістычнага грамадства.

Маскоўскі Мастацкі тэатр заслужана ўзнагароджан вышэйшымі ўзнагародамі СССР — ордэнам Леніна і ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга. Яго лепшыя майстры першыя атрымалі годнасць народных артыстаў Саюза ССР і таксама ўзнагароджаны ордэнамі Савецкага Саюза. Гэты выдатны калектыў дэманстраваў свае дасягненні на сусветнай Парыжскай выстаўцы і выклікаў усеагульную ўхвалу. Такіх пахвал, якія выпалі на долю МХАТ'а, ні адзін тэатр у свеце яшчэ не атрымоўваў. Гэта была дэманстрацыя савецкага мастацтва, якое з'яўляецца перадавым мастацтвам свету.

МХАТ—гэта школа для ўсяго савецкага тэатральнага мастацтва. Гэта здабытак не толькі рускай культуры, але ўсёй савецкай культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу.

Творчасць МХАТ'а натхняе і вучыць майстроў тэатраў братніх рэспублік. Мастацтва вялікага рускага народа, яркім выразнікам якога з'яўляецца МХАТ, ёсць невычэрпная крыніца для творчай вучобы работнікаў тэатраў Савецкай Беларусі. Работнікі нашых тэатраў павінны ўдумліва і глыбока вывучаць творчасць МХАТ'а, з тым, каб яго лепшыя традыцыі выкарыстаць у сваёй творчай рабоце.

Саракагадовы юбілей выдатнага Мастацкага тэатра—гэта трыумф савецкага мастацтва. Толькі ў шчаслівай краіне соцыялізма магчым такі буйны росквіт народнага мастацтва, якое выражае думкі і пачуцці народа і з'яўляецца любімым усім народам.

Няхай жыве комуністычная партыя, якая вырошчвае і рухае наперад соцыялістычнае мастацтва!

Няхай жыве і працуе на шчасце народа маскоўскі Мастацкі Акадэмічны тэатр!

Слава мудраму правадыру вялікага савецкага народа — таварышу Сталіну!



УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
АБ УЗНАГАРОДЖАННІ МАСКОЎСКАГА ОРДЭНА ЛЕНІНА МАСТАЦКАГА АКАДЭМІЧНАГА ТЭАТРА СССР ІМЯ М. ГОРКАГА ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

За выдатныя заслугі ў развіцці савецкай тэатральнай культуры, у сувязі з 40-гадовым юбілеем, узнагарадзіць Маскоўскі ордэна Леніна Мастацкі Акадэмічны тэатр СССР імя М. Горкага ордэнам **Працоўнага Чырвонага сцяга.**

Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Г. ПЕТРОЎСКІ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль, 26 кастрычніка 1938 г.

Узнагароджанне артыстаў МХАТ

У сувязі з 40-гадовым юбілеем Маскоўскага ордэна Леніна Мастацкага Акадэмічнага тэатра СССР імя М. Горкага (МХАТ) Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР узнагароджаны ордэнамі Саюза ССР рад артыстаў МХАТ.

Ордэнам Леніна ўзнагароджаны народная артыстка СССР О. Л. Кніпер-Чэхава, народны артыст СССР М. М. Тарханаў, народныя артысткі РСФСР М. П. Ліліна і Ф. В. Шаўчэнка.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга ўзнагароджаны 10 артыстаў і работнікаў тэатра, у тым ліку: народны артыст СССР Л. М. Леанідаў, раней узнагароджаны ордэнам Леніна, заслужаная артыстка А. О. Сцепанава, заслужаныя артысты А. І. Чэбан, В. А. Орлоў і іншыя.

Ордэнам «Знак Почета» узнагароджан 21 работнік тэатра; ганаровай граматай Вярхоўнага Совета СССР — 13 работнікаў МХАТ.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Глінішчаўскі завулак ў Маскве, дзе жыве народны артыст СССР В. І. Неміровіч-Данчэнка, пераіменован у вуліцу Неміровіча-Данчэнка.

АБ ПРЫСВАЕННІ ЗВАННЯЎ АРТЫСТАМ МХАТ'а

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР званне народнага артыста РСФСР прысвоена 11 чал., у тым ліку: Андроўскай Ольге Нікалаеўне, заслужанай артыстцы РСФСР, Еланскай Клаўдзіі Нікалаеўне, заслужанай артыстцы РСФСР; Сахнаўскаму Васілію Грыгор'евічу, заслужанаму артысту РСФСР і інш.

Званне заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР прысвоена: Кедраву Міхаілу Нікалаевічу, заслужанаму артысту РСФСР; Падгорнаму Нікалаю Афанас'евічу, заслужанаму артысту РСФСР; Ізралеўскаму Барысу Львовічу, заслужанаму артысту РСФСР; Грэлеіслаўскаму Івану Якаўлевічу, мастаку, загадваючаму пастановачнай часткаю тэатра і Телешэву Нікалаю Дзімітрыевічу, загадваючаму музеем тэатра.

Званне заслужанага артыста РСФСР прысвоена 19 чал., у тым ліку: Алеевай Еўдакіі Андрэеўне, Белакураву Уладзіміру Вячэслававічу і інш.

СЛАЎНАМУ ЮБІЛЯРУ
Маскоўскаму ордэна Леніна Мастацкаму Акадэмічнаму тэатру імя А. М. Горкага

На святкаванне саракагадовага юбілея МХАТ у Маскву выехала дэлегацыя работнікаў тэатральнага мастацтва БССР. У складзе брыгады заслужаныя артысты рэспублікі тт. Уладамірскі, Ільінскі, Міровіч, артысты тт. Дзенісаў, Сокал і Траянскі.

Дэлегацыя павезла ад імя работнікаў мастацтваў БССР адрас-прывітанне, тэкст якога друкуем ніжэй.

Работнікі соцыялістычнага мастацтва Савецкай Беларусі горача і шчыра вітаюць слаўны калектыў МХАТ'а імя Горкага ў дзень яго выдатнага саракагадовага юбілея.

Юбілей вашага тэатра — вялікае свята ўсёй квітнеючай савецкай культуры. Вы — носьбіты лепшых культурных традыцый вялікага рускага народа. Вы — майстры і таленавітыя наватары рэалістычнага мастацтва, з'яўляліся і з'яўляецеся настаўнікамі для вялікай арміі работнікаў савецкага тэатра, якія вучацца ў вас майстэрству і вялікаму мастацтву жыццёвай праўды.

Заснавальнікі і настаўнікі МХАТ'а—К. С. Станіслаўскі і В. І. Неміровіч-Данчэнка — любімыя, дарагія імёны для ўсіх нас. Ніколі не знікне памяць і не згасне слава аб дарагім К. С. Станіслаўскім, геніяльным мастаку рускага тэатра. Вялікія майстры вашага тэатра В. І. Неміровіч-Данчэнка, Масквін, Качалаў, Леанідаў, Кніпер-Чэхава, Хмелеў, Тарасава і шмат іншых — узоры для жыцця і творчасці кожнага савецкага мастака.

У краіне соцыялізма, дзе партыя Леніна — Сталіна стварыла ўсе ўмовы для росквіту соцыялістычнага па зместу і нацыянальнага па форме мастацтва, ваш тэатр дабіўся вялікіх творчых поспехаў, прадэманстраваўшы ўсяму свету росквіт савецкай, лепшай у свеце, тэатральнай культуры. Ваш тэатр любіць і шануе савецкі народ — гэта лепшая ўзнагарода за сорак год чэснай, высокаталенавітай работы.

Мы, работнікі мастацтваў ордэнаноснай БССР, вітаючы вас, жадаем вам новых вялікіх поспехаў — стварэння выдатных сцэнічных твораў, ярка адлюстроўваючых цудоўную савецкую сапраўднасць, росквіт чалавечай асобы ў краіне соцыялізма пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, вялікую сталінскую дружбу народаў Саюза ССР.

Чакаем ад вашых лепшых майстроў, майстроў мастацтва вялікага рускага народа, далейшага ўмацавання творчай сувязі з работнікамі мастацтваў братніх нацыянальных рэспублік, узнаўлення шчыльнай творчай сувязі з намі — работнікамі мастацтваў Савецкай Беларусі.

Слава заснавальнікам і майстрам выдатнейшага савецкага тэатра — МХАТ'а імя Горкага.

Няхай жыве квітнеючае соцыялістычнае мастацтва, узрошчанае партыяй Леніна — Сталіна!

Няхай жыве наш правадыр і настаўнік, лепшы друг савецкага мастацтва — вялікі Сталін!

ПРЫВІТАННЕ ГЕРАІНЯМ-ЛЁТЧЫЦАМ!

Сёння Масква сустракае гераінь. Сёння ў сталіцу вялікага Савецкага Саюза вяртаюцца тры арліцы савецкай авіяцыі — Валянціна Грызадубава, Паліна Осіпенка і Марына Раскова. І Масква і ўвесь савецкі народ з новым уздымам апладыруюць мужным дочкам нашага народа, якія ўпісалі новую слаўную старонку ў гісторыю перамог сталінскай авіяцыі, геройчным подвігам уславілі нашую радзіму.

Гераіні-лётчыцы перад усім светам прадэманстравалі, на што здольны жанчыны соцыялістычнага грамадства, прадэманстравалі гераізм, мужнасць і адвагу, беззаветную адданасць радзіме — гэтыя лепшыя якасці нашага народа. За 26 з паловай гадзін яны праляцелі 6450 кілометраў, перавысіўшы ўсе міжнародныя жаночыя авіяцыйныя рэкорды. Яны ляцелі на самалёце, які носіць гордае імя, дарагое для кожнага савецкага патрыёта, імя — «Родина». У імя радзімы, у імя свайго народа жанчыны-лётчыцы зрабілі геройчны пералёт.

«З імем Сталіна мы перамагалі, перамагаем і будзем перамагаць. Савецкія лётчыцы лятаюць і будуць лятаць далей усіх лётчыц у свеце»,—так заявіла ад імя свайго экіпажа Марына Раскова.

Імя Сталіна натхняла лётчыц на геройчны пералёт. З імем Сталіна ў сэрцы яны перамаглі ўсе цяжкасці і бліскуча выканалі ганаровае заданне радзімы.

Пералёт тт. Грызадубавай, Осіпенка і Расковай яшчэ раз пераканаўча паказаў, што адлегласці не страшаць савецкіх людзей, што Далёкі Усход — зусім не далёкі для савецкай авіяцыі. Геройчны пералёт жанчын - лётчыц з новай сілай паказаў, што ў кожную мінуту сотні і тысячы нашых пілотаў — сыноў і дачок радзімы на магутных караблях савецкай авіяцыі будуць на любым участку граніцы, дзе нясе небяспека ваеннага нападу на свяшчэнную савецкую зямлю.

«Ваша адвага, хладнакроў'е і высокае лётнае майстэрства, праяўленыя ў найцяжэйшых умовах шляху і пасадкі, выклікаюць захапленне ўсяго савецкага народа», — пісалі ў тэлеграме Грызадубавай, Осіпенка і Расковай таварышы Сталін і Молатаў.

І гэтымі словамі, з гарачым пачуццем любві вітае наш народ сваіх дачак-гераінь.

Імёны тт. Грызадубавай, Осіпенка і Расковай сталі любімымі імёнамі нашай моладзі, нашага народа. Быць такімі, як яны — мара соцень і тысяч дзяўчат краіны Советаў.

Увесь народ, уся краіна верылі ў бліскучае завяршэнне пералёту слаўнымі дочкамі соцыялістычнай радзімы. І калі абарвалася сувязь экіпажа з зямлёй каля блакітнага Байкала, увесь народ быў перакананы, што лётчыцы перамогуць стыхію, перамогуць усе цяжкасці на сваім шляху. З якім глыбокім хваляваннем на працягу некалькіх дзён прыслухоўвалася маці-радзіма да радыёхваль з адным жаданнем: пачуць блізкі і знаёмы голас сваіх дачок.

І радзіма паслала на пошукі геройчнага экіпажа сваіх мужных сыноў — лётчыкаў і парашутыстаў.

Радзіма прышла на дапамогу. Мужны экіпаж быў выведзены з тайгі пасланцамі народа. Радзіма зноў пачула родныя галасы сваіх дачак. І першымі іх словамі былі словы падзякі любімаму правадыру вялікаму Сталіну, маці-радзіме.

Увесь шлях па вялікай магістралі ад Хабараўска да Масквы быў трыумфальным шляхам гераінь - лётчыц. Савецкі народ іх сустракаў на кожнай станцыі і паўстанку, кожным горадзе і вёсцы з захапленнем і радасцю.

Тт. Грызадубава, Осіпенка і Раскова — гэта тыповыя прадстаўнікі жанчын соцыялістычнага грамадства, выхаваных партыяй Леніна — Сталіна. Савецкая жанчына нараўне з мужчынамі ўслаўляе бліскучымі подзвігамі магутнасць і несакрушальную сілу вялікага Савецкага Саюза.

З імем Сталіна геройчныя байцы Чырвонай Арміі разбілі банды самураяў ля возера Хасан. З імем Сталіна геройчны экіпаж самалёта «Родина» ўпэўнена ляцеў у далёкі шлях. З імем Сталіна на вуснах і ў сэрцы тры лётчыцы перамаглі стыхію.

З імем Сталіна кожны патрыёт радзімы, так як гераіні-лётчыцы, гатоў выканаць любое заданне партыі і ўрада. І калі фашысцкія варвары паспрабуюць напасці на нашу радзіму, з імем Сталіна на вуснах, на зямлі, вадзе і паветры сыны і дочкі нашага вялікага народа стануць, як адзін, на абарону свяшчэннай савецкай зямлі.

Сёння родная Масква сустракае сваіх гераінь. І народ Савецкай Беларусі разам з усімі народамі вялікага Савецкага Саюза выказвае сваё захапленне гераізмам лётчыц - патрыётак радзімы і шле гарачае, шчырае прывітанне!

Слава гераіням, адважным дочкам радзімы!

Слава партыі Леніна — Сталіна, выхаваўшай такіх выдатных лётчыц!

Слава вялікаму народу Савецкага Саюза, які мае такіх выдатных дачок, як Грызадубава, Осіпенка, Раскова!

МАСКВА, КРЭМЛЬ

Таварышам СТАЛІНУ і МОЛАТАВУ

Дарагія Іосіф Вісарыёнавіч і Вячаслаў Міхайлавіч!

Сёння атрымалі Вашу тэлеграму з прывітаннем Цэнтральнага Камітэта нашай любімай партыі.

Дзень гадавіны нашага дрэйфа ператварыўся ў вялікае свята. Сэрцы нашы напоўніліся гордасцю за аказаныя нам увагу і давер'е. Мы, 15 савецкіх патрыётаў нашай вялікай, любімай радзімы, выхаваныя комуністычнай партыяй, Вамі, любімы таварыш Сталін, ператворым наш дрэйф ва ўзор большэвіцкай настойлівасці, выканання вялікіх задач, якія стаяць перад намі.

Ніякія цяжкасці, небяспекі, лішэнні нам не страшны. Чулыя адносіны да нас партыі і ўрада і ўсяго вялікага народа надаюць нам цвёрдасць, непераможнасць.

Просім перадаць Цэнтральнаму Камітэту і ўраду нашу найвялікшую ўдзячнасць за клопаты, нашу ўпэўненасць у тым, што чырвоны сцяг нашай радзімы не дрогне ў нашых руках да пераможнага канца.

По даручэнню калектыва «Седова»

Бадзігін.
Трафімаў,


24 кастрычніка.

Сёння 40-гадовы юбілей Маскоўскага ордэна Леніна Мастацкага Акадэмічнага тэатра імя А. М. Горкага

ТЭАТР ВЯЛІКАЙ РУСКАЙ КУЛЬТУРЫ



К. С. СТАНІСЛАЎСКІ — заснавальнік МХАТ'а.



В. І. НЕМІРОВІЧ-ДАНЧЭНКА — заснавальнік МХАТ'а.

Яны не шукалі славы, яны не думалі аб славе, — тыя, хто сорак год таму назад у невялічкім будынку пад Масквой праводзілі свае першыя рэпетыцыі, закладаючы асновы маскоўскага Мастацкага тэатра. Найскромны з скромных і вялікі ў сваёй скромнасці К. С. Станіслаўскі быў прасякнут адным імкненнем — увасобіць у жыццё свае погляды на тэатральнае мастацтва, прынесці на сцэну вялікую праўду жыцця, пранізаць мастацтва верай у праўду і ў жыццё. Слава прышла потым, прышла сама, народжаная магутным талентам, азарыўшым сцэну новым жыватворчым святлом. І слава тэатра і яго заснавальнікаў стала сусветнай, такой, якую ведалі толькі нямногія прадстаўнікі сусветнага тэатральнага мастацтва, толькі нямногія тэатральныя калектывы на ўсім земным шары.

Імя К. С. Станіслаўскага стала вядома за межамі нашай радзімы яшчэ да рэвалюцыі. Яго высока ацанілі і як актора і як рэжысёра. І тэатр, заснаваны ім разам з В. І. Неміровічам-Данчэнка, яшчэ да рэвалюцыі набыў за мяжой шырокую вядомасць. Дарэвалюцыйная гастрольная паездка тэатра за граніцу прайшла з велізарным поспехам і адыграла нямалую ролю ў развіцці тэатральнага мастацтва ў Еўропе і Амерыцы. Але сапраўднай славы маскоўскі Мастацкі тэатр дасягнуў пасля рэвалюцыі, калі ён стаў выражэннем велізарных перамог совецкага тэатральнага мастацтва, калі яго творчасць набыла новыя фарбы, калі ён атрымаў магчымасць шырока ажыццяўляць свае замыслы.

Імя геніяльнага майстра совецкага тэатра не раз, асабліва ў нядаўнія дні апошняга развітання з ім, ставілася побач з імем буравесніка рэвалюцыі, вялікага пралетарскага пісьменніка Максіма Горкага. Пры ўсёй рознасці іх жыццёвых шляхаў, іх абодвух аб'ядноўвала беззаветнае служэнне мастацтву, у якім яны абодва бачылі благароднейшы сродак ўзвышэння чалавека, вызвалення яго ад прыгнёту. І Станіслаўскаму, як ноедбіту перадавых ідэй у мастацтве, было цесна і душна ў жалезных рамках ніколаеўскага рэжыму. Не выпадкова іменна ён падхапіў неўмірučыя горкаўскія словы: «Чалавек — гэта гучыць горда!» і смелым выклікам кінуў іх у твар тым, якія ўсімі сваімі чорнымі сіламі імкнуліся прыніжаць гэта гордае імя — «чалавек». Не выпадкова ў Мастацкім тэатры, які носіць цяпер ганаровае імя Горкага, словы Ніла былі іскрай для дэманстрацыі перадавой інтэлігенцыі супроць прыгонніцкай манархіі. І калі над краінай прагрымела Вялікая соцыялістычная рэвалюцыя, Станіслаўскі не мог не адчуць, што адкрываюцца новыя прасторы для мастацтва, у якім было яго жыццё, што прыходзіць новы гледач, годны варты наследнік вялікай чалавечай культуры, што прыдзе і новы драматург, які створыць сапраўды праўдзівыя творы, што адлюструюць новае жыццё пераможнага народа.

Тых, хто з-за мяжы прыязджаў у Совецкую Расію, і сяброў яе, і ворагаў, вабіў маскоўскі Мастацкі тэатр. Замежныя госці наглядалі і новага гледача, у скураных тужурках, і бліскучую ігру тых, каго гэты гледач натхняў для новай творчасці. І тыя, хто прыязджаў з сімпатыямі і сяброўскімі пачуццямі, умелі распазнаваць рэвалюцыйную сілу, якую нёс у сваіх пастаноўках маскоўскі Мастацкі тэатр. Англійскі пісьменнік Артур Рэнсом, праўдзіва і сумленна апісваючы жыццё краіны Советаў, і ў сваіх карэспандэнцыях у англійскай прэсе і ў сваёй кнізе «Шесть недель в Советской России» пісаў аб тым уражанні, якое зрабіла на яго пастаноўка «Дзядзі Вані» ў Мастацкім тэатры:

«Бездань аддзяляе Чэхава ад нас. Гэта рэч мае гістарычную цікавасць, таму, што жыццё, якое яна паказвае, знікла назаўсёды... І сюжэт «Дзядзі Вані» здаваўся цяперашняй публіцы больш чуждым, чым оперы «Самсон і Даліла», якую я чуў на мінулым тыдні. Я разумеў, што, з аднаго боку, рэвалюцыя ўмацавалася, а з другога — што Чэхаў вялікі майстар, таму што яго твор пабудаваў мост паміж старым жыццём і новым і ўзрушаў рэвалюцыйную публіку таксама моцна, як некалькі год таму назад публіку старога рэжыму. Больш таго, п'еса быццам вырасла ў працэсе рэвалюцыі, бо рэвалюцыя ўзмацніла тую іронію, якую Чэхаў наўрад ці хацеў даць, калі ствараў свой твор. «Такім было старое жыццё?» — гаварыў я сабе, вяртаючыся па снезе дадому. — Калі яно сапраўды было такое, дык слава богу, што яно знікла».

Замежныя пісьменнікі, прыязджаючы ў Совецкую Расію, шукалі сустрэчы з Станіслаўскім. Многія скажалі яго выказванні, адны па неразуменню, другія па злой волі, але ўсё больш шырокім здабыткам зарубежных мас станавілася праўда, што Станіслаўскі жыве і працуе разам з пралетарыятам, дыхае рэвалюцыяй і натхняецца ёю.

Нямецкі пісьменнік Артур Голічэр, які напісаў адну з першых кніг аб Совецкай Расіі, пасля наведання раду спектакляў маскоўскага Мастацкага тэатра, сустрэўся з Станіслаўскім, каб даведацца ў яго «аб шляхах і надзеях рускага тэатра». І ён убачыў тады ў Станіслаўскім, «гэтым чароўным чалавеку і вялікім мастаку» — «сапраўднага рэфарматара сучаснага тэатра».

Гадоў праз шэсць пасля Артура Голічэра наведаў Станіслаўскага вядомы амерыканскі пісьменнік Тэодар Драйзер. «Я сустрэў, — піша ён, — высокага, добра выглядаўшага старога з сівымі валасамі, бліскучымі цёмнымі вачыма, з тварам, сваімі буйнымі і рэзка выражанымі рысамі, рабіўшым глыбокае ўражанне». Тэодар Драйзер у сваю першую паездку ў СССР зразумеў далёка не ўсё, што ён убачыў у нас, не зразумеў ён многага і ў развіцці совецкага мастацтва і, у прыватнасці, у поглядах Станіслаўскага. Аднак, ён павінен быў сцвердзіць, што Станіслаўскі — з рэвалюцыяй, з народам, творыць для народа, для рэвалюцыі. Перадаючы сваю гутарку з Станіслаўскім, Драйзер прыводзіць наступныя словы Станіслаўскага: «Сцэна і мастацтва будуць іграць у палітычнай і выхаваўчай рабоце ў Расіі велізарную ролю, ды яно ўжо іграе велізарную ролю. Кожны завод ставіць спектаклі, у кожным рабочым клубе ёсць тэатральны гурток. Ва ўсёй краіне іграюць».

Тэодар Драйзер глядзеў у Маскве не толькі спектаклі Мастацкага тэатра, але задаволілі яго толькі пастаноўкі МХАТ. Французскі пісьменнік Жорж Дзюамель, параўноўваючы ў сваёй кнізе «Поездка в Москву» пастаноўкі Мастацкага і другіх маскоўскіх тэатраў, зрабіў вывад: «Я аддаю перавагу Мастацкаму тэатру, тэхніка якога, удасканаленая і простая, засталася амаль нязменнай на працягу трыццаці год».

Але ў той-жа час сярод зарубежных наведвальнікаў Мастацкага тэатра былі такія, якія бачылі істотную розніцу паміж тым, што паказваў тэатр цяпер і трыццаць год таму назад. Олівер Сейлор, амерыканскі тэатральны крытык, аўтар кніг «Русский театр и революция», «Московский художественный театр» і інш. пісаў пасля пастаноўкі «Мертвых душ»:

«Мне здаецца, што калі-б Мастацкі тэатр паставіў «Мёртвыя душы» ў 1917 годзе, дык яны не прагучалі-б на сцэне так, як яны гучаць цяпер. Цяпер Мастацкі тэатр паказаў не толькі ўсе адмоўныя тыпы ў акружэнні ўсіх іх адмоўных бакоў, але змог паказаць на фоне гэтага дарэформеннага жыцця тыя мёртвыя дрэвы, якія павінны былі быць зрэзаны падчыстую рэвалюцыяй».

А тыя, хто не баяўся агітацыйнай функцыі тэатра, захапляліся і тым новым рэвалюцыйным словам, якое стала гучаць са сцэны Мастацкага тэатра. Нямецкі пісьменнік - публіцыст Бруно Фрэй у сваёй кнізе аб СССР падрабязна спыняецца на пастаноўцы «Бронепоезда» Вс. Іванова ў МХАТ'е і, апісваючы настрой, які панаваў у зале ў часе славутай сцэны на званіцы, заяўляе: «Няма такой тоўстай кнігі, такога вогненнага даклада, такой бліскучай дэманстрацыі, якая так неадхільна хвалююча перадала-б перажыванні пралетарскай інтэрнацыянальнасці, як гэты эпізод на сцэне... Сцэна замяняе і залу для даклада, ператвараецца ў дэманстрацыю, становіцца «маральнай установай», мастацкім перажываннем эпохі».

Мінулагодняя гастрольная паездка МХАТ'а ў Парыж была трыумфам тэатра і ўсяго совецкага мастацтва. Вядомы французскі крытык Стэфан Прысель пісаў тады аб пастаноўках Мастацкага тэатра: «Акторы, мастакі, рэжысёры гэтага тэатра, быць можа, самага дасканалага з усіх тых, якія толькі ўдавалася нам бачыць, так па-майстэрску валодаюць сваім мастацтвам, што ў спектаклях усё здаецца цудоўна простым. Гледачу паказваюць сапраўдныя глыбіні жыцця... Тут сапраўды, як гэта хацелася Стэндалю — «душа гаворыць з душой». Зусім не бачыш тэхнікі. Ва ўмовах тэатра імя Горкага яна стала такой-жа натуральнай, якімі для нас з'яўляюцца рухі ці вопратка... І не відаць у спектаклі «прэм'ераў» і «зорак». Ад самай малай ролі да самай важнай кожны актор — роўным чынам вялікі ў сваёй глыбока рэалістычнай ігры... Няма ні зманлівага натуралізма, ні стылізацыі, — толькі сапраўдныя словы і сапраўдныя рухі. Тое, што паказваюць акторы тэатра імя Горкага, так хвалюе сваёй праўдай, што спачатку адчуваеш сябе ашаломленым, быццам апынуўся перад якімсьці цудам»...

У прыватнасці, аб «Любові Яравой» Прысель піша: «Цудоўная і бурлівая эпоха, аб якой напамінае «Любоў Яравая», дзякуючы дапамозе Мастацкага тэатра, выклікае моцнае і ні з чым не параўноўваемае хваляванне». І артыкул свой ён заканчвае наступнымі словамі: «Калі ў вас толькі ёсць магчымасць, абавязкова паглядзіце хаця-б адзін з спектакляў Мастацкага тэатра. І зайздросце совецкай публіцы, што ў яе ёсць такі тэатр!»

Мастацкі тэатр прадстаў перад светам як найвыдатнейшы совецкі тэатр, выпеставаны пралетарыятам, пераможным на адной шостай зямнага шара.

З года ў год расла і расце сусветная слава Мастацкага тэатра і ўсё відавочней становіцца для ўсяго свету геніяльная праўдзівасць творчага метада Станіслаўскага, яго сістэмы, як адзіна вядучай да стварэння сапраўдна рэалістычнага тэатральнага мастацтва. І ў гэтыя дні, калі працоўныя краіны Советаў святкуюць саракагоддзе свайго выдатнага, непраўзыйдзенага і горача любімага тэатра, іх пачуцці радасці і гордасць падзяляюць усе тыя, каму сапраўды дарагі развіццё і росквіт мастацтва, хто за межамі нашай краіны змагаецца з фашысцкім варварствам, імкнецца выбрацца з запляснелага балота буржуазнай руціны на светлую дарогу свабоднай, рэалістычнай творчасці.

М. ЖЫВАЎ



А. М. ГОРКІ (стаіць у цэнтры) з удзельнікамі спектакля «Мяшчане» (1902 г.).

ЮР. СОБАЛЕЎ

Маскоўскі мастацкі тэатр і руская літаратура

За сорак год свайго слаўнага творчага жыцця МХАТ даў 99 пастановак. З іх 66 — п'есы рускіх аўтараў. Можна лёгка ўявіць сабе Мастацкі тэатр без Сафокла, Мальера, Байрана, нават без Шэкспіра, але МХАТ не быў-бы МХАТ'ам без Чэхава, Горкага, Грыбаедава, Остроўскага, Дастаеўскага, Ал. К. Талстога, Льва Талстога і плеяды сучасных аўтараў.

Калі летам 1897 года, пасля сваёй знамянальнай сустрэчы, Вл. І. Неміровіч-Данчэнка і К. С. Станіслаўскі ўстанаўлялі прынцыпы, па якіх будзе жыць у мастацтве новы тэатр, яны вырашылі, што ў рэпертуар іх тэатра ўвойдуць лепшыя п'есы як рускіх, так і замежных пісьменнікаў, да гэтага часу не знайшоўшых сабе месца на іншых сцэнах. І ўжо ў першым сезоне руская класіка была прадстаўлена трагедыяй Ал. К. Талстога «Цар Фёдар Іоанавіч», а сучасная драматургія — «Чайкай» Чэхава.

Трагедыя Талстога захапляла тэатр сваёй гістарычнасцю, магчымасцю пошукаў новых форм у мастацтве і тым, што, праляжаўшы пад цэнзурнай забаронай звыш 30 год, яна з'яўлялася сапраўднай навінкай для гледача. Захапленне гістарызмам адбілася і ў наступным сезоне (1898—99 гг.), калі тэатр паказаў «Смерць Іоана Грознага».

Але не трагедыі А. Талстога, пастаўленыя як яркае, маляўнічае відовішча, у якіх ігралі выдатныя акторы і ў першую чаргу Масквін — «Фёдар», не яны паклалі пачатак таму новаму тэатру, якім павінен быў стаць МХАТ. Спектакль 17 снежня 1898 года—прэм'ера «Чайкі» А. П. Чэхава — вось сапраўднае духоўнае нараджэнне тэатра.

Формула Станіслаўскага — «Мастацкі тэатр заснаван на благароднейшых традыцыях шчэпкінскага рэалізма» — пашырана яго ж сцвярджэннем аб наватарстве Чэхава. Шчэпкінскі рэалізм і наватарства Чэхава, — вось што паказала ўсю творчую прыроду Мастацкага тэатра.

Мастацкі тэатр раскрыў у Чэхаве тое, што «не перадаецца словамі, а схавана ад іх ці ў паўзах, ці ў позірку актораў, у выяўленні іх унутранага пачуцця. Пры гэтым ажываюць і мёртвыя прадметы на сцэне, і гукі, і дэкарацыі, і вобразы, ствараемыя артыстамі, і самы настрой п'есы і ўсяго спектакля» (К. С. Станіслаўскі).

Тэатр развеяў прадузяты погляд супроць Чэхава, як пісьменніка «не для сцэны». Аднак, прызнаўшы, што ў Чэхаве ёсць зусім новыя элементы сцэнічнасці, крытыка прадаўжала бачыць у Чэхаве пісьменніка «песіміста». Аб «Дзядзю Ваню» і «Трох сёстрах», не меўшых на прэм'ерах такога аднадушнага поспеху, з якім прайшла «Чайка», пісалі як аб «здаровых п'есах хворых настрояў» як аб «перапевах старых матываў». Нават аб «Вішнёвым садзе», які жыве ў рэпертуары Мастацкага тэатра амаль 35 год і з'яўляецца адным з самых моцных яго спектакляў, — нават аб «Вішнёвым садзе» гаварылі як аб песімістычнай п'есе.

Але цікава, што моладзь пакалення канца XIX і пачатку XX стагоддзя зусім не была ўпэўнена ў правільнасці меркаванняў аб чэхаўскім песімізме. А. В. Луначарскі ў адным з сваіх артыкулаў аб МХАТ цытыраваў найцікавейшае пісьмо нейкага гімназіста. Юны аўтар палемізіраваў з Луначарскім, які пісаў аб «жалкіх героях і гераінях «Трох сясцёр»: «Ён упікаў мяне ў неразуменні дзеяння, якое Чэхаў утварае на гледача. Ён пісаў прыблізна так: калі я глядзеў «Трох сясцёр», я ўвесь дрыжаў ад злосці. Да чаго-ж давялі людзей, як запалохалі, як замуравалі. А людзі добрыя. Усе гэтыя Вершыніны, Тузенбахі, усе гэтыя мілыя, прыгожыя сёстры. Гэта-ж благародныя істоты, яны-ж маглі-б быць шчаслівымі і даваць шчасце іншым. Яны маглі-б, па крайняй меры, кінуцца на самаафярную барацьбу з душыўшым усё злом. Але замест гэтага яны хныкчуць і гінуць. Не, Анатолій Васільевіч, гэта п'еса павучальная і клічучая да барацьбы. Калі я ішоў з тэатра дадому, то кулакі мае сціскаліся да болю і ў цемры мне здавалася тая пачвара, каторай, хоць-бы цаной сваёй смерці, трэба нанесці сакрушальны ўдар».

Пасля «Чайкі», вяртаючы Чэхава рускай драматургіі, Мастацкі тэатр тым самым змагаўся за сучаснага аўтара. Бо і Чэхаў-жа сорак год таму назад быў маладым сучасным драматургам.

Барацьба за сучаснага аўтара праходзіць праз усю гісторыю Мастацкага тэатра. Значны этап на гэтым шляху — барацьба за Горкага. І калі першая горкаўская п'еса «Мяшчане» (1902 год) была пастаўлена тэатрам як жанравая бытавая драма, дык ужо «На дне», сыграная ў тым жа годзе, мела велізарнейшы поспех. Тэатр раскрыў у п'есе і сапраўдную тэатральнасць Горкага, і, што асабліва важна, адчуў яе высокі соцыяльны аптымізм.

Горкі аказаў велізарны ўплыў на грамадска-палітычны напрамак тэатра. Горкаўскае ўздзейнічанне на тэатр не гледзячы ні на якія часовыя разыходжанні (а гэта здарылася з поваду «Нікалая Стаўрогіна», пастаўленага ў 1913 годзе і выклікаўшага страсны пратэст Аляксея Максімавіча), нязменна прадаўжалася на працягу ўсіх сарака год гісторыі МХАТ і выявілася асабліва глыбока ўжо ў нашы дні.

Новая сустрэча тэатра з Горкім адбылася ў 1933 годзе, калі тэатр паставіў п'есу П. Сухоціна «У людзях», змантыраваную з урыўкаў «Маленства», «Маіх універсітэтаў» і апавяданняў «Страсці-мордасці» і «Гаспадар». У 1934 годзе МХАТ сыграў «Егора Булычова», у 1935 — «Врагаў».

«Горкі моцна звязаў сябе сваімі вялікімі мастацкімі творамі з рабочым рухам Расіі і ўсяго свету». Гэта ленінскае вызначэнне (Ленін, т. XIV, стар. 211) гістарычнай ролі геніяльнага пісьменніка моцна ўвайшло ў свядомасць Мастацкага тэатра.

У дарэвалюцыйную паласу гісторыі МХАТ Горкі ўваходзіў як малады драматург, за якога трэба было змагацца. У паслярэвалюцыйны перыяд — перыяд новай гісторыі МХАТ — Горкі ўваходзіць як настаўнік цэлага пакалення совецкіх драматургаў.

Чэхаў і Горкі — буйнейшыя драматургі, аказаўшыя сваё рашаючае ўздзеянічанне на творчыя шляхі МХАТ дарэвалюцыйнага перыяду. П'есы Чырыкава, Найдзёнава, Ярцэва ў першыя сезоны, а ў пазнейшыя гады — С. Юшкевіча, Л. Андрэева, С. Сургучова, вядома, не мелі і не маглі мець такога значэння. Але паяўленне іх у рэпертуары гаварыла аб самым шчырым імкненні тэатра прыцягваць новых аўтараў і працаваць з імі. Работа з аўтарам — адна з цікавейшых і павучальнейшых раздзелаў у гісторыі Мастацкага тэатра.

Руская класіка займае адно з галоўных месц у рэпертуары МХАТ. Тут прадстаўлены Гоголь — «Рэвізор», «Мёртвыя душы», Грыбаедаў — «Гора ад ума», Дастаеўскі — «Браты Карамазавы», «Нікалай Стаўрогін», «Сяло Сцяпанчыкава», «Дзядзюшкін сон», Остроўскі — «Снегурачка», «На ўсякага мудраца досыць прастаты», «Гарачае сэрца», «Таленты і паклоннікі», «Граза». Л. Н. Талстой — «Улада цемры», «Жывы труп», «Васкрасенне», «Анна Карэніна». Тургенеў — «Месяц у вёсцы» і спектакль, у які ўвайшлі «Дзе тонка, там і рвецца», першы акт «Нахлебніка» і «Правінцыялка». Былі пастаўлены таксама Салтыкоў-Шчэдрын («Смерць Пазухіна»), Пісемскі («Самаўпраўцы»), два пушкінскіх спектаклі — «Барыс Гадуноў» (1907 год) і маленькія трагедыі — «Моцарт і Сальеры», «Каменны госць», «Пір у часе чумы». І кожная з гэтых пастановак, ажыццёўленая ў розных прыёмах, па сутнасці ставіла ўсё адну і тую ж мэту: да канца зразумець ідэйны і соцыяльны змест п'есы.

У гэтым таксама была своеасаблівая барацьба за аўтара. Цікава, напрыклад, што пастаноўка «Гора ад ума» ў свой час аднадушна была ацэнена, як удаўшаяся спроба ў камедыі «даўно знайшоўшай сваю душу, знайсці зараз сваё цела». У спектаклі ўваскрэсла найярчэйшая карціна грыбаедаўскай Масквы.

Барацьбой за аўтара было і ўключэнне Тургенева ў рэпертуар МХАТ. Спектаклі павінны былі паказаць — і паказалі — прадузятасць і абмежаванасць меркаванняў аб аўтары «Месяца ў вёсцы», як аб пісьменніку «не для сцэны».

Надзвычай змястоўным і глыбокім быў працэс работы тэатра над Остроўскім. «На ўсякага мудраца досыць прастаты» была пастаўлена як п'еса эпічная. «Гарачае сэрца» ў трактоўцы К. С. Станіслаўскага стала сапраўды народным тэатральным відовішчам. Грамадскі сэнс гэтага паказу быў у тым, што за Хлыновым і Градабоевым раскрываліся хлынаўшчына і градабоеўшчына, як соцыяльная з'ява мінулага рускага жыцця.

МХАТ ажыццявіў не менш сямі інсцэніровак літаратурных твораў. Мы ўжо называлі іх — гэта аповесці і раманы Дастаеўскага, гэта паэма Гогаля, гэта раманы Талстога. Тое, што тэатр браўся за інсцэніроўкі найвялікшых твораў рэалістычнай рускай літаратуры, кожны раз сведчыла аб нездаволенасці тэатра п'есамі, паяўляўшыміся ў тыя годы.

Высокая патрабавальнасць да мастацкага слова — вось што ляжала ў аснове мастацтва МХАТ'а. І тут трэба гаварыць аб велізарнай ролі ў МХАТ'е Вл. І. Неміровіча-Данчэнка, для якога мастацкая літаратура заўсёды была чымсьці пачуццёвым, канкрэтным, адчувальным. І зразумела, чаму Неміровіч-Данчэнка марыў паказаць на сцэне «Еўгенія Онегіна» — раман, які склала, па мудрай заўвазе Белінскага, «энцыклапедыю рускага жыцця».

Ператвараючы паэмы, аповесці і раманы ў матэрыял для прадстаўлення на тэатры, МХАТ менш за ўсё думае зацвердзіць новы жанр, паказаць законнасць інсцэніровак. Не, ён звяртаецца да мастацкай літаратуры таму, што ў ёй — у рускай мастацкай літаратуры — знаходзіць поўнае задавальненне сваім высокім творчым запросам. Так нараджаецца тэма — «Мастацкі тэатр, як люстра рускай літаратуры».

Работа МХАТ'а з сучаснымі совецкімі драматургамі — гэта зусім новы раздзел у яго гісторыі, глыбока змястоўны і павучальны, які апавядае аб тым, якім шляхам ішоў тэатр да совецкай тэмы. Барацьба за сучаснага аўтара, якую ўпарта і страсна вёў маскоўскі Мастацкі тэатр ужо ў першыя годы свайго жыцця, з яшчэ большай настойлівасцю і страснасцю вядзецца ім у нашы дні.

Маскоўскі Мастацкі тэатр заўсёды быў і заўсёды будзе збіральнікам жывых сіл рускай літаратуры.

Сёння 40-гадовы юбілей Маскоўскага ордэна Леніна Мастацкага Акадэмічнага тэатра імя А. М. Горкага

ТВОРЧЫ ШЛЯХ МАСТАЦКАГА ТЭАТРА

Маскоўскі ордэна Леніна Мастацкі Акадэмічны тэатр СССР імя А М Горкага адзначае 27 кастрычніка сорак год свайго жыцця Узнікнуўшы ў 1898 годзе, Мастацкі тэатр спачатку называў сябе Мастацка-агульнадаступным тэатрам. Гэтай назвай тэатр падкрэсліваў, што яго мастацтва звяртаецца да дэмакратычных пластоў рускай інтэлігенцыі, да ўсіх тых, хто адчувае невыносны гнёт палітычнай рэакцыі і грамадскага застою.

Мастацкі тэатр утварыўся са зліцця двух груп моладзі 90-х гадоў З аднаго боку, гэта былі аматары, якія працавалі разам з Канстанцінам Сяргеевічам Станіслаўскім (Аляксеевым) у «Таварыстве мастацтва і літаратуры» з другога боку, гэта былі вучні музыкальна-драматычнага вучылішча Маскоўскага філарманічнага таварыства, дзе выкладаў Уладзімір Іванавіч Неміровіч-Данчэнка І Станіслаўскі і Неміровіч-Данчэнка былі вядомымі людзьмі ў тэатральнай Маскве таго часу Крытык, белетрыст і драматург Неміровіч-Данчэнка стварыў сабе вялікае імя як аўтар цэлага раду п'ес («Цана жыцця», «Апошняя воля» і інш.), ішоўшых з поспехам на сцэне Малага тэатра. К. С. Станіслаўскі за дзесяць год існавання Таварыства мастацтваў і літаратуры (1888 – 1898) праславіўся як рэжысёр-наватар, смела і ярка ставіўшы такія класічныя п'есы, як «Отэлло», «Урыэль Акоста» і інш. Адначасова Станіслаўскі быў вядомы і як выдатны актор, выконваўшы ролі гераічнага і характэрнага рэпертуару.

Абодва гэтыя тады маладыя дзеячы марылі аб новым сур'ёзным тэатры, у якім можна было-б ставіць п'есы вялікага літаратурнага значэння, у якім можна было-б стварыць стройны ансамбль артыстаў на аснове праўдзівай і жыццёвай рэалістычнай ігры.

Знаёмства і сустрэча Станіслаўскага і Неміровіча-Данчэнка ў 1897 годзе вырашылі лёс будучага тэатра. Паміж двума мастакамі ў выніку іх гутаркі быў заключан саюз для сумеснай работы над стварэннем новага тэатра. Пасля працяглай і напружанай падрыхтоўкі, 27 (14) кастрычніка 1898 года Мастацка-агульнадаступны тэатр адкрыў свае дзверы, абраўшы для пачатку пастаноўку трагедыі А. К. Талстога «Цар Фёдар Іоанавіч».

Нават першы спектакль паказаў масквічам, што перад імі сапраўды новая з'ява ў сцэнічным мастацтве. На змену паверхоўнай акторскай ігры прыйшло ўдумлівае, глыбока-жыццёвае, рэальнае выкананне. Замест выпадковых дэкарацый і касцюмаў рэжысура тэатра стварыла яркую і сакавітую карціну Маскоўскай Русі Кожная дробязь абстаноўкі была прадумана і абрана з любоўю і густам. Гістарычная п'еса была пастаўлена як кавалак сапраўднай рэчаіснасці маскоўскай старыны.

Але без блізкасці з сучаснай драматургіяй, без аўтара, які здолеў-бы выказаць у сваіх творах настроі і спадзяванні рускай інтэлігенцыі, тэатр не змог-бы па-сапраўднаму замацаваць сваіх пазіцый.

Такім аўтарам і з'явіўся для Мастацкага тэатра Антон Паўлавіч Чэхаў. Пастаўленая драма Чэхава «Чайка» канчаткова вызначыла твар тэатра. Мастацкі тэатр знайшоў ключ да сцэнічнага вырашэння тых тонкіх псіхалагічных задач, якія ставіць перад акторамі Чэхаў.

Пасля «Чайкі» стала зразумелым, што мастацтва Мастацкага тэатра з'яўляецца мастацтвам псіхалагічнага рэалізма, для якога даступен паказ унутранага жыцця людзей ва ўсёй яго складанасці і глыбіні.

Творчая дружба Мастацкага тэатра з Чэхавым была плённай і радаснай. Для Мастацкага тэатра Чэхаў напісаў «Тры сястры» і «Вішнёвы сад». У Мастацкім тэатры былі пастаўлены таксама «Дзядзя Ваня» і «Іваноў».

Яшчэ больш важным фактам для жыцця Мастацкага тэатра была яго творчая сустрэча з Аляксеем Максімавічам Горкім.

На Горкага выключна моцнае ўражанне ўтварылі спектаклі Мастацкага тэатра У сваіх пісьмах да Чэхава Горкі з захапленнем піша аб сваім знаёмстве з Мастацкім тэатрам, з яго работамі і яго людзьмі. Вось чаму, калі Горкі рашыўся на свае першыя драматургічныя вопыты, ён аддаў Мастацкаму тэатру і «Мяшчане» і «На дне», пастаўленых у МХАТ'е ў 1902 годзе. Поўнакроўны рэалізм Горкага, яго рамантычная вера ў чалавека далі магчымасць Мастацкаму тэатру з выключнай сілай паставіць «На дне». Гэта быў спектакль, у якім праявілася прадчуванне насоўваючыхся рэвалюцыйных год. гэта быў свайго роду пралог да 1905 года.

За першыя 8 год Мастацкі тэатр (1898—1906) стварыў цудоўную трупу. Станіслаўскі, Масквін, Качалаў, Леанідаў, Вішнеўскі, Лужскі, Арцем, Кніппер, Ліліна, Савіцкая, Самарава, Андрэева і іншыя былі не толькі мастакамі буйных індывідуальнасцей, але і акторамі, валодаўшымі адзіным метадам творчасці, звязанымі агульным разуменнем задач сцэнічнага мастацтва

Вырасла і ўмацнілася рэжысура К. С. Станіслаўскага і В. І. Неміровіча-Данчэнка Абодва рэжысёры ўмелі ствараць спектаклі, дзе спалучаліся правіклівае чытанне аўтарскага тэкста з багаццем жыццёвых падрабязнасцей і вагляданняў, а самае галоўнае—абодва рэжысёры разумелі, што тэатр—гэта перш за ўсё актор, і працавалі над самым метадам сцэнічнага мастацтва.

Пасля 1906 года Мастацкі тэатр рашуча звяртаецца да твораў рускай класічнай драматургіі і ставіць сваёй мэтай па-новаму асэнсаваць лепшыя творы вялікіх рускіх пісьменнікаў «Гора ад ума» Грыбаедава, «Рэвізор» Гогаля, «На ўсякага мудраца досыць прастаты» Остроўскага, «Смерць Пазухіна» Салтыкова, камедыі Тургенева і драмы Пушкіна, «Жывы труп» Талстога,—усё гэта яркія вехі на творчым шляху МХАТ'а за годы 1906—1917. Да гэтага-ж часу адносіцца інсцэніроўка МХАТ'ам раманаў Дастаеўскага, з якіх найбольшае значэнне мела пастаноўка «Братоў Карамазавых»

Ставячы Дастаеўскага, Мастацкі тэатр паказаў што яго задачай з'яўляецца поўнае раскрыццё вобразаў аўтара выключна сродкамі акторскай ігры. Урыўкі рамана былі пастаўлены на сукнах, скупа расквечаных толькі нязначнымі дэкарацыйнымі падрабязнасцямі Уся ўвага гледача была згуртавана на акторскім выкананні. Гэта было ўрачыстасцю акторскай ігры, трыумфам Качалава, Леанідава, Масквіна, Лужскага.

Вялікую Кастрычніцкую соцыялістычную рэвалюцыю Мастацкі тэатр сустрэў як тэатр з сусветным імем. Ен адразу зразумеў, што яго задачы не звужаюцца, а пашыраюцца, што перад тэатрам адкрываецца неабсяжны прастор для творчасці.

Перад Мастацкім тэатрам паўстала праблема папаўнення трупы. Мастацкі тэатр знаходзіць для сябе кадры ў тых студыях, якія абкружалі тэатр у першыя годы рэвалюцыі. У 1924—25 гадах канчаткова складваецца новы калектыў тэатра, у якім дружна працуюць акторы старэйшага і сярэдняга пакаленняў І ў нашы дні тэатр працягвае выхоўваць малалыя кадры, і ў цяперашні час на праграме спектакляў МХАТ'а мы сустракаем побач імёны бацькоў, дзяцей і ўнукаў.

Паралельна Мастацкі тэатр працуе над стварэннем новага рэпертуару Тэатр зноў звяртаецца да рускай класікі і ставіць «Гарачае сэрца» Остроўскага, інсцэніроўкі «Мёртвых душ», «Васкрасення», «Анны Карэнінай» Самы падыход да класічных твораў набывае новую соцыяльную вастрыню. Мастацкі тэатр умее знаходзіць у тэкстах мінулага тыя матывы і тыя тэмы, якія блізкі і хвалюючы для сучаснага совецкага гледача.

Велізарнае прынцыповае значэнне мае новая блізкасць Мастацкага тэатра да Горкага МХАТ ставіць «Егора Булычова», «У людзях» і «Варагаў». Асабліва важнай аказваецца работа над «Ворагам» Тут тэатру ўдаецца дабіцца таго, што В. І. Неміровіч-Данчэнка назваў «класным гучаннем вобраза» Імя Горкага ў гэтыя годы ўключаецца ў назву тэатра як ганаровае замацаванне ўнутранай блізкасці рэалізма Горкага і рэалізма МХАТ'а.

Не перастае Мастацкі тэатр імкнуцца і да таго, каб знайсці сярод сучасных пісьменнікаў, у асяроддзі совецкай літаратуры тых, хто зможа задаволіць высокія патрабаванні тэатра, яго жаданне ставіць творы поўнакаштоўнай сучаснай драматургіі. На сцэне МХАТ'а дэбютыруюць у якасці драматургаў Усевалад Іваноў («Бронепоезд», «Блакада»), Леонаў («Унцілаўск»), Катаеў («Растратчыкі», «Квадратура круга»), Олеша («Тры таўстуны»), Вірта («Зямля») і іншыя, МХАТ ставіць дзве п'есы К. А. Трэнёва – «Пугачоўшчыну» і «Любоў Яравую». Такім чынам, класіка руская і сусветная, драматургія Горкага і совецкія п'есы становяцца тымі асноўнымі ўстоямі, на якіх будуецца рэпертуарная палітыка Мастацкага тэатра. Вось чаму сваю 40-ю гадавіну МХАТ сустракае пастаноўкамі «Гора ад ума» і «Дасцігаеў і другія», а затым мяркуе паказаць «Палаўчанскія сады» Леонава

Вясною 1937 года совецкі ўрад узнагародзіў Мастацкі тэатр ордэнам Леніна, яго работнікі атрымалі высокія званні і ордэны, работа МХАТ'а абкружаецца асаблівымі клопатамі і ўвагай.

Улетку 1937 года на Мастацкі тэатр была ўскладзена ганаровая місія быць паўпрэдам совецкага мастацтва на міжнароднай выстаўцы ў Парыжы. Гэта адказнае заданне МХАТ выканаў з гонарам

Усё гэта разам узятае ясна паказвае, што Мастацкі тэатр—вядучы тэатр не толькі совецкага, але і сусветнага мастацтва. Гэта – высокая трыбуна, з якой совецкая інтэлігенцыя, совецкая дэмакратыя апавядае на магутнай мове рэалістычнага мастацтва новую праўду чалавецтва, тую новую мараль, якую нясе свету соцыялістычнае грамадства вялікай краіны Советаў.

Н. ВОЛКАЎ.



А. М. ГОРКІ ў перыяд першай пастаноўкі МХАТ'ам яго п'есы «На дне» (1902 г.).



А. П. ЧЭХАЎ. Буйнейшы драматург МХАТ'а.

ЮБІЛЕЙНАЯ ВЫСТАЎКА

У трох залах фае Дома актора Усерасійскага тэатральнага таварыства адкрыта выстаўка, прысвечаная 40-годдзю Мастацкага тэатра.

Выстаўка адлюстроўвае гісторыю нараджэння тэатра, яго першы спектакль «Цар Фёдар». На наступных стэндах паказаны пастаноўкі чэхаўскіх п'ес, п'ес Горкага «Мяшчане» і «На дне».

На радзе стэндаў паказана першая гастрольная паездка тэатра ў Ялту, Пецербург і іншыя гарады і пастаноўкі «Улады цемры», «Юлія Цэзара», «Бранда», «Сіняй птушкі», работы тэатра над класікай.

На выстаўцы багата прадстаўлены экспанаты, адлюстроўваючыя работу тэатра за час пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

Цікава адлюстравана лабараторная работа мастакоў над спектаклямі тэатра. У радзе карандашных і акварэльных зарысовак паказана работа мастака Сімава над пастаноўкамі «Цар Фёдар», «Рэвізор», «Снегурачка», «Бронепоезд», работы мастакоў Егорава і Юона.

Спецыяльны пакой прысвечан памяці К. С. Станіслаўскага. У ім адлюстравана жыццё гэтага выдатнага мастака: яго маленства, юнацтва і ўвесь яго творчы шлях.

ТВОРЧАЯ НАРАДА

МАСКВА (Ад наш. спец. кар.). 20 і 21 кастрычніка ў Маскве, ва Усесаюзным Камітэце па справах мастацтваў адбылася нарада па пытаннях становішча і далейшага развіцця мастацтва ў БССР.

У нарадзе прынялі ўдзел намеснікі старшыні Усесаюзнага Камітэта тт Храпчэнка і Маркелаў, члены брыгады Камітэта, якая абследвала становішча беларускага мастацтва – народны артыст СССР тав Самасуд, народны артыст СССР тав Гліер, кампазітар Белы, работнікі апарата Камітэта; ад работнікаў мастацтваў БССР прысутнічалі дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР кампазітары тт. Туранкоў і Багатыроў, народны паэт рэспублікі Янка Купала, начальнік Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тав Озірскі, кіруючыя і творчыя работнікі тэатраў і калектываў іншых галін мастацтва БССР

Нарада заслухала і абмеркавала даклад брыгады Усесаюзнага Камітэта аб выніках абследвання работы асноўных прадпрыемстваў і калектываў мастацтва БССР.

Дакладчык тав Грынберг падрабязна ахарактарызаваў, якую подлую шкодніцкую, дыверсійную работу па падрыву і развалу нашага мастацтва вялі на працягу многіх год ворагі народа. Зараз беларускае мастацтва знаходзіцца на шляху вялікага творчага ўздыму. Але вынікі шкодніцтва канчаткова не ліквідаваны і дагэтуль У рабоце мастацкіх калектываў БССР шмат недахопаў і зрываў.

Нездавальняючае становішча на музыкальным фронце Філармонія БССР не стала сапраўдным правадніком музыкальнай культуры ў масы працоўных Патрэбна ўмацаваць ансамблі Філармоніі добрымі прафесіянальнымі кадрамі і папоўніць іх лепшымі сіламі мастацкай самадзейнасці. Абурае тое, што Філармонія БССР дагэтуль не звяртала ўвагі на прыцягненне да работы лепшых майстроў мастацтва рэспублікі Яркі прыклад такой ганебнай практыкі—тое, што Філармонія не правяла ніводнага канцэрта з удзелам заслуж арт рэспублікі Александроўскай артысткі Младэк і іншых лепшых прадстаўнікоў музыкальнага майстэрства, а таксама вядомых у рэспубліцы музыкантаў. Філармонія мала ўдзяляла ўвагі на пашырэнне канцэртнай дзейнасці ў рабочых клубах, у раёнах.

Кампазітары БССР зараз працуюць над вялікімі творамі У хуткім часе, пасля патрэбнай дапрацоўкі, будзе паказана опера Цікоцкага «Міхась Падгорны» Закончыў работу над операй кампазітар Багатыроў Над новымі операмі працуюць кампазітары Туранкоў і Шчэглоў

Створан беларускі балет «Салавей» Аднак, яго нельга прызнаць вялікай творчай удачай. Музыка балета не звязана арганічна з народнай беларускай музыкай, што магло ўзбагаціць твор і надаць яму патрэбную яркасць і арыгінальнасць

Вялікай перашкодай у развіцці музыкальнай творчасці з'яўляецца тое, што Саюз совецкіх кампазітараў БССР не займаўся пытаннямі творчасці кампазітараў Кампазітары працавалі адасоблена і замкнута І зараз яшчэ Саюз кампазітараў больш нагадвае канцылярыю, чым творчую арганізацыю

У галіне тэатральнага мастацтва асабліва востра адчуваецца недахоп кадраў Гэта – вынік шкодніцкай падрыўнай дзейнасці ворагаў. Калектывы тэатраў засмечаны людзьмі, якія нічога агульнага не маюць з мастацтвам Нехапае патрэбных рэжысёрскіх і акторскіх кадраў. Няма яшчэ сур'ёзнай работы з драматургамі

Рад тэатраў (музкамедыі, яўрэйскі, тэатр оперы) не маюць патрэбных умоў для работы.

Найбольш адсталы ўчастак на фронце мастацтваў БССР—выяўленчае мастацтва Работа Саюза мастакоў у занядпадзе У БССР няма мастацкага інстытута, які мог-бы даваць маладым мастакам патрэбную кваліфікацыю і веды. Адзінае ў рэспубліцы мастацкае вучылішча знаходзіцца ў цяжкіх умовах Дагэтуль не ўстаноўлен напрамак прафесіянальны профіль вучылішча

Абмеркаванне даклада тав. Грынберга яшчэ больш шырока і поўна ўскрыла недахопы ў развіцці мастацтваў БССР.

Вялікую ўвагу ўдзяліла нарада пытанням развіцця музыкальнага мастацтва БССР.

Народны артыст СССР тав. Самасуд адзначыў, што ў БССР ёсць усе магчымасці для хуткай ліквідацыі адставання музыкальнага фронта. Ёсць здольныя кампазітары і выканаўцы. З поспехам можа працаваць тэатр оперы і балета, які мае таленавітых салістаў, здольных дырыжораў, добры хор Тав Самасуд указаў, што беларускім кампазітарам патрэбна дабівацца большай арыгінальнасці і яркасці сваіх твораў

Вялікую ўвагу трэба звярнуць Усесаюзнаму Камітэту і Упраўленню па справах мастацтваў на музыкальную асвету ў БССР Беларуская Кансерваторыя патрабуе дапамогі – укамплектавання кваліфікаванымі выкладчыкамі, паляпшэння матэрыяльных умоў для выкладчыкаў і студэнтаў

Не маюць належных умоў для работы многія музыкальныя школы рэспублікі

На гэта ўказалі ў сваіх выступленнях тав. Бергер (Кансерваторыя БССР). тав. Зісман (Магілёўская муз школа)

Кампазітары БССР творча не звязаны з кампазітарамі братніх рэспублік і ў першую чаргу—Масквы і Ленінграда. У самім Саюзе кампазітараў—замкнутасць, саюз адарван ад грамадскасці. Беларускія кампазітары недастаткова вучацца на творчасці класічных майстроў рускай музыкі.

Музыкальным калектывам і кампазітарам БССР патрэбна вялікая дапамога з боку лепшых майстроў музыкальнага фронта Саюза ССР.

БССР павінна мець і ўласнае музыкальнае выдавецтва.

Гэтыя пытанні развіцця музыкальнай культуры ў БССР паставілі перад Усесаюзным Камітэтам кампазітары тт. Багатыроў. Белы. тав Прагін

Нашаму тэатральнаму мастацтву патрэбна вялікая дапамога. Перш за ўсё нам павінны дапамагчы буйнейшыя майстры тэатра – рэжысёры, мастацтвазнаўцы Масквы Патрэбна сталая творчая сувязь работнікаў нашых тэатраў з тэатрамі Масквы, вучоба на лепшых здабытках вялікай рускай культуры

Тэатры БССР павінны быць умацаваны і папоўнены патрэбнымі кадрамі, ачысціўшыся ад усяго нягоднага. Патрэбна ліквідаваць нездаровыя элементы групаўшчыны ў калектывах тэатраў і нездаровыя ўзаемаадносіны паміж асобнымі калектывамі.

Няспынныя пераезды тэатраў перашкаджаюць сур'ёзнай творчай рабоце. Для забеспячэння стацыянравання тэатраў трэба спыніць заліцнія перакідкі іх з месца на месца.

Час прад'явіць тэатрам БССР вялікія патрабаванні ў галіне мастацкай якасці і культуры спектакляў. Сумеснай работай з драматургамі трэба дабіцца адыходу ад існуючага шаблона ў беларускай драматургіі і стварэння высокамастацкіх сцэнічных твораў пра нашыя шчаслівыя дні соцыялізма.

Патрэбна рашуча асудзіць элементы зазнайства і самазаспакоенасці. нецярплівасці да крытыкі, што яшчэ не зжылі тэатры БССР

Патрэбна большая ўвага Упраўлення па справах мастацтваў да пытанняў культурнага абсталявання тэатраў, паляпшэння матэрыяльных умоў творчых работнікаў Патрэбна дапамога дзіцячаму тэатру БССР, каб ён стаў сапраўдным рэспубліканскім тэатрам, здольным выконваць свае пачэсныя абавязкі па абслугоўванню дзяцей і моладзі.

Арганізаваная ў гэтым годзе тэатральная школа павінна быць акружана такой увагай, каб школа з'явілася сапраўднай базай падрыхтоўкі акторскіх кадраў У гэтай школе трэба адкрыць аддзяленне па падрыхтоўцы актораў для яўрэйскага тэатра.

Павышэнню кваліфікацыі творчых работнікаў тэатраў, вырошчванню здольнай моладзі. барацьбе за высокую культуру спектакля павінна быць аддадзена галоўная ўвага ў гэтым сезоне

Гэтыя меркаванні аб рабоце тэатраў выказалі ў сваіх выступленнях тт Малчанаў, Віньяр, Рахленка, Гантман, Трэпель, Шустэр, тт. Розенталь і Салалоўнікаў (Усесаюзны Камітэт)

У БССР ёсць здольныя маладыя мастакі. Рад мастакоў працуе зараз над творамі на патрэбную сучасную тэматыку.

Але чаму дагэтуль мастакамі БССР не створаны такія творы, якія маглі-б стаць здабыткам усесаюзнага мастацтва?

Перш за ўсё таму, што развіццё выяўленчага мастацтва шмат год тармазілі і зрывалі ворагі народа

Другая прычына – заняпад работы ў саюзе мастакоў, адсутнасць увагі з боку кіруючых арганізацый да творчага росту мастакоў.

Скульптары БССР стварылі за апошні час рад значных твораў А жывапісцы амаль нічым яшчэ не могуць ганарыцца. У беларускім жывапісу не выкарчаван уплыў фармалізма, які раней быў вельмі моцным. Жывапісцы БССР недастаткова знаёмы з творчасцю вялікіх рускіх мастакоў-рэалістаў і не дастаткова вучацца на класічных узорах рэалізма ў жывапісу.

Ні Саюз мастакоў, ні Упраўленне па справах мастацтваў не ўдзялялі ўвагі ўзняццю палітычнага і культурнага ўзроўню мастакоў Адсюль – элементы самазаспакоенасці і зазнайства, існуючыя ў калектыве мастакоў Аргкамітэт Саюза мастакоў не займаецца творчымі пытаннямі, вырошчваннем маладых мастакоў – работай студый Саюз совецкіх мастакоў павінен быць аформлен у самы бліжэйшы час Ен павінен стаць дзейсным творчым калектывам. Без гэтага не могуць быць вырашаны вялікія задачы, якія стаяць зараз перад мастакамі БССР,—падрыхтоўка выстаўкі да 20-годдзя вызвалення Беларусі ад белапалякаў, праблема сапраўднага росквіту беларускага выяўленчага мастацтва. У самы бліжэйшы час патрэбна вырашыць пытанне аб арганізацыі ў БССР музея мастацтваў Для гэтага музея ўжо ёсць значныя фонды твораў выяўленчага мастацтва. Музей з'явіцца вялікім сродкам культурнага і мастацкага выхавання маладых мастакоў і шырокіх мас працоўных.

Віцебскае мастацкае вучылішча патрэбна раздаваць і ўмацаваць. Яно павінна падрыхтоўваць для нашага мастацтва маладыя кадры жывапісцаў і скульптараў Патрэбна перабудаваць работу Ізакамбіната, каб ён з'явіўся арганізатарам работы мастакоў і выдаўцом іх прадукцыі.

Мастакі БССР павінны ўстанавіць шчыльную творчую сувязь з лепшымі мастакамі Масквы, Ленінграда і братніх рэспублік Аб гэтых бліжэйшых задачах развіцця выяўленчага мастацтва БССР гаварылі т. Керзін, тав. Лебедзеў (ВКІ).

Падрабязна ахарактарызаваў становішча мастацтваў БССР тав. Озірскі.

Намеснік старшыні Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР тав Маркелаў адзначыў, што Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР не ўжыла рашучых мер для канчатковай выкарчоўкі вынікаў шкодніцтва. Упраўленне недастаткова займалася палітычным выхаваннем работнікаў мастацтваў і павышэннем іх прафесіянальнай кваліфікацыі. Калектывы работнікаў мастацтваў не ўстанавілі патрэбнай сувязі з партыйнымі і совецкімі арганізацыямі, што павінна з'явіцца адной з рашаючых умоў у стварэнні сапраўдных узораў соцыялістычнага мастацтва. Дагэтуль не акрэслены функцыі абласных упраўленняў па справах мастацтваў і Упраўленні фактычна не разгарнулі работы.

Мастацтва пагранічнай Совецкай Беларусі не павінна адставаць – адзначыў намеснік старшыні Усесаюзнага Камітэта тав. Храпчэнка – Патрэбна расціць і смялей высоўваць уласныя маладыя кадры і ўстанавіць творчую сувязь з лепшымі прадстаўнікамі мастацтваў вялікага рускага народа Патрэбна ўзняць патрабаванні да мастацкай якасці твораў Упраўленне па справах мастацтваў павінна ажыццявіць намечаныя нарадай арганізацыйныя мерапрыемствы і па-большэвіцку кіраваць творчым працэсам ва ўсіх галінах мастацтва.

Нарада выявіла многія прычыны, якія перашкаджаюць развіццю нашага мастацтва, і наменціла рад важнейшых мерапрыемстваў па дапамозе творчаму росквіту беларускага мастацтва. Гэтыя мерапрыемствы павінны быць ажыццёўлены Усесаюзным Камітэтам. Упраўленнем па справах мастацтваў з дапамогай усёй нашай грамадскасці.

Усе сілы работнікаў мастацтваў зараз павінны быць накіраваны на тое, каб канчаткова ліквідаваць вынікі шкодніцтва і забяспечыць магутны творчы ўздым соцыялістычнага мастацтва Совецкай Беларусі.

Росквіт нашага мастацтва, стварэнне выдатнейшых твораў аб соцыялістычным росквіце Совецкай Беларусі і не зборонай магутнасці дасць права прадэманстраваць творчыя поспехі мастацтва ў Маскве, на дэкадзе беларускага мастацтва.

Партыя Леніна—Сталіна, вялікі Сталін акружаюць работнікаў мастацтваў клопатамі і ўвагай. Патрэбна апраўдаць гэтыя клопаты і давер'е большэвіцкай работай на фронце нашага соцыялістычнага мастацтва.

ПРЫВІТАННЕ УДЗЕЛЬНІКАМ УСЕБЕЛАРУСКАЙ АЛІМПІЯДЫ!

ДА НОВЫХ ВЫШЫНЬ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Сёння ў Менску — сталіцы Беларускай ССР — адкрываецца III Усебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці, прысвечаная XX гадавіне ленінска-сталінскага комсамола і XXI гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Звыш 1.500 лепшых спевакоў, танцораў, музыкантаў, якія прадстаўляюць шматтысячную армію ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці беларускага народа, прадэманструюць на алімпіядзе свае дасягненні, прадэманструюць сваю гарачую любоў да соцыялістычнай радзімы і беззаветную адданасць комуністычнай партыі, свайму народу і правадыру — вялікаму Сталіну.

Дзякуючы ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы, пышным кветам квітнее культура і мастацтва беларускага народа. Толькі дваццаць адзін год прайшоў з таго сусветна-гістарычнага дня, калі пад кіраўніцтвам загартаванай у баях партыі Леніна — Сталіна рабочы клас былой царскай Расіі ў саюзе з сялянствам скінуў ненавісныя ланцугі капіталізма і абсалютызма. Дваццаць адзін год — гэта гістарычна вельмі невялікі тэрмін, але якія зрухі, якія змены адбыліся ў нашай цудоўнай краіне за гэты час!

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя «дала народу не толькі свабоду ад царызма, ад капіталізма, але і карэннае паляпшэнне яго матэрыяльнага і культурнага становішча» (Кароткі курс гісторыі ВКП(б), стар. 326).

Мастацкая самадзейнасць з'яўляецца іменна такім участкам, дзе велізарны рост матэрыяльнага і культурнага дабрабыту беларускага народа відаць найбольш ярка, найбольш рэльефна.

Ворагі народа, якія зацясаліся ў кіраўніцтва Управлення па справах мастацтваў, нямала намаганняў прыкладалі для таго, каб затармазіць няўхільны рост народнай творчасці. Нямала дзелавых, практычных мерапрыемстваў было сарвана былым шкодніцкім кіраўніцтвам, нямала каштоўных прапаноў было пакладзена пад сукно.

Вынікі шкодніцтва ў кіраўніцтве мастацкай самадзейнасцю адчуваюцца да гэтага часу. Дагэтуль, напрыклад, няма поўнага ўліку самадзейных калектываў, нехапае кадраў для гурткоў, амаль няма новага рэпертуару, Дом народнай творчасці ўсё яшчэ не мае памяшкання для масава-метадычнай работы і г. д.

Аднак, не гледзячы на існуючыя недахопы, рабочая і калгасная мастацкая самадзейнасць ідзе наперад — да новых вышынь народнага мастацтва.

Раённыя, гарадскія і абласныя алімпіяды, якія закончыліся ўчора, прадэманстравалі новы ўздым народнай творчасці.

За перыяд ад другой да трэцяй Усебеларускай алімпіяды створаны новыя сотні харавых, музыкальных, танцавальных і драматычных калектываў. На сцэны рабочых і калгасных клубаў выйшлі новыя тысячы ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

Гэта ў асноўным — комсамольцы, совецкая жыццёрадасная моладзь, гарачыя патрыёты сваёй соцыялістычнай радзімы, якія ўмеюць па-стаханаўску працаваць і весяліцца. Але побач з моладдзю можна часта сустрэць і глыбокіх старыкоў, для якіх толькі зараз, пры совецкай уладзе, пачалося сапраўднае чалавечае жыццё. Так, сярод удзельнікаў самадзейнага калгаса «Пераможац» Кабыльшчанскага сельсовета Дамачавіцкага раёна можна сустрэць 70-гадовага Кірэя Запатылак — выканаўца беларускіх нацыянальных танцаў. У Крукавіцкім сельсовеце таго-ж раёна вядом 75-гадовы калгаснік Міхаіл Панцелеенка — выканаўца беларускіх матываў на жалейцы і беларускіх нацыянальных танцаў.

Мастацкая самадзейнасць за апошні год вырасла не толькі кольказна, але і якасна. На раённых і абласных алімпіядах выяўлена шмат выдатных калектываў і паасобных выканаўцаў, высунутых для ўдзелу ва Усебеларускай алімпіядзе.

З выдатным з'явішчам мы сустрэліся на менскай абласной алімпіядзе. Беларускі хор Селенжаўскага сельсовета Чырвонаслабодскага раёна (пад кіраўніцтвам калгасніка Серады), не маючы ў сваім складзе ні аднаго яўрэя, спеў побач з беларускімі і ўкраінскімі песнямі—яўрэйскую песню «Бірабіджан» на яўрэйскай мове. На другі дзень алімпіяды маладая калгасніца з калгаса «Пролетарый» Рачэнскага сельсовета Любаньскага раёна Марыя Філюта спела яўрэйскую нацыянальную песню «Фейгеле» (на яўрэйскай мове).

На фоне дзікага разгулу расізма і антысемітызма ў фашысцкіх краінах моцная дружба народаў Совецкага Саюза, знайшоўшая такое яркае адлюстраванне ў інтэрнацыянальным рэпертуары многіх самадзейных гурткоў,—факт велізарнага палітычнага значэння.

Мастацкая самадзейнасць БССР прыходзіць да III Усебеларускай алімпіяды з вялікімі дасягненнямі, але гэта не значыць, што трэба заплюшчыць вочы на недахопы, якія перашкаджаюць хутчэй рухацца наперад.

Гэтыя недахопы адносяцца ў першую чаргу да якасці выканання паасобнымі калектывамі і салістамі новых рэчаў з свайго рэпертуару.

Заклік народных артыстаў СССР—дэпутата Вярхоўнага Совета СССР тав. Масквіна і дэпутата Вярхоўнага Совета РСФСР тав. Барсавай аб шэфстве майстроў мастацтва над калектывамі мастацкай самадзейнасці не знайшоў яшчэ, нажаль, патрэбнага водгуку сярод работнікаў мастацтваў БССР. Між тым, многія работнікі мастацтва з вялікай ахвотай узялі-б шэфства над адным-двума калектывамі самадзейнасці, але не ведаюць — над якімі, як гэта аформіць. Абавязак ажыццявіць практычна гэта важнейшае мерапрыемства ляжыць на Беларускім рэспубліканскім камітэце саюза работнікаў мастацтваў і Доме народнай творчасці БССР, якія пакульшто ў гэтай галіне яшчэ нічога не зрабілі.

Мастацкая самадзейнасць БССР — напярэдадні адказнейшага экзамена. У канцы 1939 года ў Маскве адбудзецца дэкада беларускага мастацтва, у якой прымуць удзел лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці БССР.

Вялікім паказам мастацкай самадзейнасці БССР будзе адзначана таксама адкрыццё Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Задача ўсіх калектываў мастацкай самадзейнасці — арганізаваць **шырокае соцыялістычнае спаборніцтва** за права ўдзелу ў дэкадзе і на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Трэцяя Усебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці, якая адкрываецца сёння, павінна паслужыць пачаткам такога соцыялістычнага спаборніцтва, — за ўцягненне новых дзесяткаў тысяч рабочых, работніц, калгаснікаў, калгасніц, гарадской і сельскай інтэлігенцыі ў мастацкую самадзейнасць, за пашырэнне і паляпшэнне рэпертуару самадзейных калектываў, за ўзняццё якасці выканання мастацкіх рэчаў на вялікую вышыню, вартую нашага шчаслівага радаснага жыцця.



Першая менская абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці.

НА ЗДЫМКУ: група хора калгаса «12 год Кастрычніка» Чырвонаслабодскага раёна, удзельнічаўшая ў алімпіядзе.

Фота Мазелева (СФ).

ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСКВІТ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя стварыла ў нашай краіне найшырэйшыя магчымасці для будаўніцтва нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу культуры ва ўсёй шматстайнасці яе форм. Адным з ярчэйшых дасягненняў культурнага будаўніцтва ў нашай краіне з'яўляецца бурны роскві народнай творчасці. У Совецкім Саюзе няма такога народа, які не стварыў-бы сваіх песень, сваіх казак і легенд, сваіх музыкальных твораў, які не меў-бы сваёй літаратуры, тэатра, сваіх пісьменнікаў, мастакоў, спевакоў, чытальнікаў і танцораў. Гэта і зразумела. Само наша жыццё — радаснае, шчаслівае і забяспечанае — выклікае патрэбнасць тварыць, весяліцца, спяваць.

«Жыць стала лепш, жыць стала весялей», — сказаў вялікі Сталін, і ў гэтых словах — невычэрпная крыніца народнай творчасці, самадзейнага мастацтва. Іменна таму першыя свае словы і спевы ўдзельнікі алімпіяд прысвячаюць геніяльнаму правадыру народаў таварышу Сталіну.

Мастацкая самадзейнасць народаў СССР б'е крыніцай. Як і ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, народы СССР і ў галіне мастацтва праяўляюць незвычайную актыўнасць і ініцыятыву. Інакш не можа быць у краіне, дзе для росту чалавечай асобы, для праяўлення яе талентаў і здольнасцей створаны неабмежаваныя магчымасці.

Гурткі растуць па ініцыятыве самога народа. У Рэчыцкім раёне, напрыклад, шырока вядом хор калгаса імя тав. Літвінава, якім кіруе скромная калгасніца Лапаціна. У Чырвонаслабодскім раёне калгасным хорам кіруе малады хлапец Серада. Хор сезонных работнікаў цагельні № 1 у Менску нават не мае кіраўніка, а спявае выдатныя беларускія народныя песні і г. д. Такіх гурткоў, дзе кіраўнікамі з'яўляюцца самі калгаснікі, налічваюцца сотні.

За апошнія годы асабліва хутка растуць кольказна і якасна самадзейныя драматычныя калектывы. Драматычныя гурткі не толькі ў гарадах, але і ў калгасах узнімаюцца да пастановкі п'ес складанага рэпертуара («Васа Жалезнова», «На дне»—М. Горкага, «Слава» — Гусева, «Вочная стаўка»—бр. Тур і Шэйніна, «Любоў Яравая»—Трэнева і інш.).

Поспехі ў галіне самадзейнага мастацтва былі-б яшчэ большымі, калі-б кіраўніцтва гэтым масавым рухам з боку Дома народнай творчасці і Упраўлення па справах мастацтваў было больш канкрэтным і аператыўным. Мастацкая самадзейнасць — вострая зброя палітычнага выхавання мас, велізарная палітычная справа. Адсюль — недапушчальнасць самацёку на гэтым важнейшым участку будаўніцтва соцыялістычнай культуры.

Мастацкую самадзейнасць трэба забяспечыць не толькі палітычным і метадычным кіраўніцтвам, але і аказаць ёй сталую дапамогу. Трэба забяспечыць усе самадзейныя калектывы палітычна-вытрыманым і мастацка-поўнакаштоўным рэпертуарам, трэба даць самадзейным гурткам добрых кіраўнікоў. Заклік народных артыстаў СССР—дэпутата Вярхоўнага Совета СССР тав. Масквіна і дэпутата Вярхоўнага Совета РСФСР тав. Барсавай аб шэфстве майстроў мастацтва над мастацкай самадзейнасцю павінен быць пачуты.

У нас у БССР ёсць Дом народнай творчасці, але, нажаль, гэта толькі пакой ў Доме ўрада, а між тым, іменна ў Доме народнай творчасці павінна быць сканцэнтравана вывучэнне вопыту народнай творчасці, падрыхтоўка патрэбных кадраў, метадыстаў, кіраўнікоў гурткоў і г. д.

Большэвіцкае кіраўніцтва мастацкай самадзейнасцю народа, усебаковая дапамога ёй забяспечаць далейшы нябачаны рост народнай творчасці, выявяць з самых глыбінь народа новыя і новыя таленты ва ўсіх галінах мастацтва, якое так прыгожа расквітнела на шчаслівай совецкай зямлі.

Д. Ф. ЖУКАЎ.

Мастацкі кіраўнік Дома народнай творчасці БССР.

ЯРКАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ ШЧАСЛІВАГА ЖЫЦЦЯ

25 кастрычніка закончылася **першая алімпіяда мастацкай самадзейнасці Менскай вобласці.** За тры дні перад шматлікімі гледачамі прайшло каля тысячы ўдзельнікаў самадзейнасці, прадэманстраваўшых свае дасягненні ў галіне народнага мастацтва. Перад журы будзе стаяць цяжкая задача—вылучыць з вялікай колькасці выдатных калектываў лепшых, бо кожны з іх мае свае вартасці, якія даюць права на ўдзел ва Усебеларускай алімпіядзе.

З вакальных калектываў трэба адзначыць, у першую чаргу, выдатны народны хор калгасніц, працуючых на менскай цагельні № 1, хор Селенжаўскага сельсовета Чырвонаслабодскага раёна з яго рэпертуарам беларускіх, украінскіх і яўрэйскіх песень, хоры рабочых клубаў імя Сталіна і металістаў, хор Цімкавіцкага Дома соцкультуры і хор калгаса «Зара» Заслаўльскага раёна. Асабліва добра была выканана хорам клуба металістаў песня аб Ежове і руская народная песня «Мой мужанька».

З харэаграфічных калектываў трэба вылучыць тэмпераментны калектыў торфаарцелі Рудзенскага раёна, а таксама калектывы будаўнікоў, металістаў, клуба дзяржгандлю і інш.

Добрае ўражанне пакінулі ансамбль клуба будаўнікоў у цэлым, джаз-ансамбль Палітэхнічнага інстытута з яго таленавітым кіраўніком тав. Фрадкіным, джаз-аркестр фабрыкі «Кастрычнік», духавы аркестр клуба металістаў, ансамбль абласнога мэблевага саюза, калектыў цымбалістаў Менскага сельскага раёна і інш.

Багата былі прадстаўлены сольныя выступленні, паказаўшыя наяўнасць значных кадраў таленавітых самародкаў—спевакоў, музыкантаў, чытальнікаў, танцораў.

Менская абласная алімпіяда з'явілася яркай дэманстрацыяй радаснага шчаслівага жыцця беларускага народа.



Першая менская абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці.

НА ЗДЫМКУ: выкладчык дукорскай поўнай сярэдняй школы Б. К. Чуланскі выконвае танец «Цыганскую венгерку».

Глеб Іванавіч Успенскі

(Да 95-годдзя з дня нараджэння)

Глеб Іванавіч Успенскі нарадзіўся 25 кастрычніка 1843 года ў г. Туле ў сям'і чыноўніка. Аб сваім маленстве ён піша так: «Усё маё асабістае жыццё, уся абстаноўка майго асабістага жыцця да 20 год асуджала мяне на поўнае зацямненне розума, поўную пагібель, слыбачэйшую дзікасць разуменняў, неразвітасць і наогул аддаляла ад жыцця белага свету на невымерную аддзеласць».

Гэтыя радкі сведчаць аб той цяжкой, удушлівай атмасферы палітычнага рэжыму Нікалая I, у якім працякала маленства Успенскага. Надзвычай чуллівы хлопчык востра рэагаваў па ўсё акружаючае. Правінцыяльная гімназія, у якой вучыўся будучы пісьменнік, гніла яго сваёй муштрай, і гэтая муштра была як-бы штуршком да літаратуры. Успенскі з велізарнай цікавасцю чытаў апавяданні Тургенева, вершы Некрасава, артыкулы Чэрнышэўскага і Дабралюбава. Яны адказвалі яму на многія пытанні, прыгнятаўшыя «хворую совесць» дапытлівага хлопчыка.

Але малады Успенскі нядоўга знаходзіўся ў сферы кніжных уплываў. У 1862 годзе на старонках журнала «Ясная Поляна» Л. Н. Талстой надрукаваў адзін з першых нарысаў Успенскага, а за гэтым нарысам на старонках розных-стайных журналаў пачалі друкавацца іншыя яго творы. Так, у 1864 годзе Успенскі пачаў друкавацца ў «Современнике» і «Русском слове». Але гэтыя журналы былі неўзабаве закрыты царскім урадам, і Успенскаму зноў давялося друкавацца ў розных дробных журналах. Толькі калі «Отечественные записки» перайшлі ў рукі Некрасава, Успенскі зрабіўся сталым супрацоўнікам гэтага журнала.

Характэрна для Успенскага тое, што да другой палавы 70-х гадоў яго ўвага, як пісьменніка, была амаль цалкам звернута на горад. Сялянскія тэмы ён закранаў надзвычай рэдка. У гэты перыяд у творах Успенскага яшчэ не было народных нотак, якімі прасякнута ўся яго далейшая творчасць.

Уважліва назіраючы жыццё горада, асабліва яго нізоў, Успенскі разумеў, што старое паранена на-смерць і асуджана на пагібель. Карціну гэтага адмірання і асуджанасці вельмі ярка намаляваў ён у «Нравах Растеряевой улицы». Гэты твор як-бы з'яўляецца сцвярджэннем таго, што адміранне і асуджанасць капіталістычнага ладу радавалі вока рэволюцыйнага пісьменніка-дэмакрата, ненавідзеўшага крывавы рэжым царызма з яго прыгнётам, гвалтам і цемрай. У гэтым-жа творы перад намі паўстае і «цёмнае гора жыцця распераеўскага абывацеля, якое прыгнечвае яго ад калыскі да магілы»; перад намі



акрэслена выступаюць нарысаванныя кісцю пісьменніка-мастака вобразы майстровых, дробных чыноўнікаў, купцоў.

Пісьменнік надзвычай ярка паказаў «панаванне прыжымкі над простым чалавекам», г. зн. эксплаатацыю селяніна і рабочага ў царскай Расіі. Незабыўны сатырычны вобраз будашніка Мымрэцова, хапаўшага ўсіх і ўся «за шыварат», жыўшага дэвізам «цягнуць» і «не пушчаць», сімвалічна адлюстроўвае бессэнсоўна-тупы рэжым жандарскай краіны.

Разам з абурэннем расце і нянавісць пісьменніка да капіталістычнага ладу. Ён стварае вобраз Міхаіла Іванавіча («Назіранні Міхаіла Іванавіча»), які выкрывае купцоў і чыноўнікаў, выступае ў абарону беднага працоўнага народа.

У канцы 70-х гадоў увага Глеба Успенскага ўсё больш і больш сканцэнтроўваецца на жыцці і быце сялянства. Ён збліжаецца з народнікамі. Але як чэсны і праўдзівы назіральнік жыцця і быту вёскі, ён сваімі апавяданнямі абвяргаў народніцкія ілюзіі і прагнозы іх рэакцыйную ідэалізацыю сялянскай абшчыны.

Глеб Успенскі належаў да таго тыпу шчырых і буйных мастакоў, для якіх факты з жывой рэчаіснасці значаць невымерна больш, чымсьці прадузятая ідэйная догма. Вось чаму нават калі ён быў звязан з народніцкім рухам і дапускаў асобныя народніцкія памылкі, ён скептычна адзываўся аб ідэі «хождения в народ». І вывады і абагульненні, выцякаўшыя з яго апавяданняў, па-сутнасці білі па народніках. Вось чаму марксісты часта карысталіся апавяданнямі і нарысамі Успенскага як пераканаўчым аргументам супроць народнікаў, супроць іх рэакцыйнай ідэалогіі. В. І. Ленін таксама не раз звяртаўся да творчасці Успенскага.

У апошнія годы свайго жыцця, назіраючы развіццё прамысловага капітала ў Расіі, мастак Успенскі ўсё рашучай адкідваў шкодныя «тэорыі» і ілюзіі народнікаў.

У апавяданні «Не ўсё кату масленіца» ёсць надзвычай характэрная заўвага Успенскага, дзе пісьменнік гаворыць аб тым, які ён будзе шчаслівы, калі «чалавек строгай, дакладнай навукі, кіруемы ў сваіх справах і думках непарушальнай логікай розуму» дакажа непазбежнасць гібелі капіталістычнага ладу.

Калі ў 1887 годзе адзначаўся 25-гадовы юбілей Успенскага, нішто не было так дорага пісьменніку, як прывітальнае пісьмо уральскіх рабочых. «Для гэтага варта жыць!» — гаварыў ён, некалькі разоў перачытваючы пісьмо.

Совецкія чытачы цэняць у асобе Глеба Успенскага выдатнага мастака-рэаліста, адданага працоўнаму народу і запечатлеўшага тыя цяжкія ўмовы, у якіх жыў наш народ у канцы мінулага стагоддзя.

К. М.

ЖОРЖ БІЗЭ

(Да 100-годдзя з дня нараджэння)

Імя кампазітара Жоржа Бізэ заўсёды звязваецца з яго оперным творам «Кармэн». Гэта з'ява невыпадковая, таму што «Кармэн» увасабляе ў сабе ўвесь творчы шлях геніяльнага опернага майстра. Але «Кармэн» не толькі краевугольны камень творчасці Бізэ, а і выдатны факт стварэння новага стылю рэалістычнай оперы, паказ сапраўднай жыццёвай праўды на опернай сцэне, і ў гэтым гістарычнае, перадавое значэнне «Кармэн» і яе аўтара. Каб стварыць «Кармэн», Бізэ патрэбна было мець не толькі адно кампазітарскае дараванне і майстэрства, трэба было быць чулым мастаком, ясна мыслячым, разумеючым, глыбока пранікаючым у жыццё, быць ідэйным, смелым барацьбітом за новае мастацтва праўды. Бізэ зразумеў і адчуў усю беднасць, безыдэйнасць, хіласць сучаснага яму музыкальнага мастацтва Францыі, якое прыкрывалася акадэмізмам, тэхніцызмам і навуковасцю. Бізэ павёў з ім бязлітасную барацьбу. «Трэба не плакаць, а змагацца,—гаварыў Бізэ.— Я не хачу нічога рабіць для вонкавага поспеху, блеску. Я хачу мець ідэю, перш чым пачынаць якую-небудзь рэч... Школа рэфрэнчыкаў, рулад і ўсялякай хлусні памірае, дык пахаваем-жа яе без слёз, без шкадавання, без хваляванняў і... наперад!»

Бізэ прайшоў складаны шлях. Нарадзіўшыся ў сям'і прафесара спеваў (у Парыжы ў 1838 годзе), Бізэ рана выяўляе свае музыкальныя здольнасці і яшчэ хлопчыкам становіцца на шлях прафесіянала-музыканта. Паспяховае заканчэнне кансерваторыі, атрыманне рымскай прэміі даюць яму магчымасць правесці тры гады ў Італіі — калысцы опернага мастацтва, упершыню адчуць сваё прызванне, зразумець упадак музыкі свайго часу і ўсвядоміць свой шлях. Вярнуўшыся на радзіму, Бізэ пачынае працаваць ужо як сталы мастак, строгі і патрабавальны да сябе.

У першых сваіх творах («Шукальнікі жэмчуга», «Пертская прыгажуня», «Джаміле») Бізэ ідзе яшчэ ў асноўным ад старых оперных традыцый, узнятай эфектнай тэатральнасці, лірычнай сантыментальнасці, экзотыкі, у яго музыцы шмат эклектычнасці, але ўжо можна ўбачыць, як паступова і ўпарта выяўляюцца рысы сапраўднага мастака, схільнасць яго да драматызма, да народных сцэн, да простага і праўдзівага паказу простых людзей, іх пачуццяў і настрояў («Пертская прыгажуня»).



Паваротным этапам, які ставіць Бізэ на яго сапраўдны шлях, з'явілася «Арлезіянка» (музыка да драмы Дадэ тойжа назвы, цяпер шырока вядомая пад назвай сюіты «Арлезіянкі»), у якой можна ўжо ясна ўлавіць будучыя рысы «Кармэн»—тэма фатальнай любві, апісанне прыроды, выкарыстанне народных напеваў і танцавальных характэрных рытмаў.

Калі першыя работы Бізэ ўжо выклікалі частыя нараканні з боку крытыкі, дык з'яўленне ў 1875 годзе «Кармэн» (сюжэт узят з аповесці Мэрымэ) з яе героямі: работніцай тытунёвай фабрыкі, салдатам, кантрабандыстамі, з бытам вуліцы, гор, дзе жыццё даведзена, па трапнаму выразу А. В. Луначарскага, да «асляпляючага зіхацення», дзе ўпершыню на опернай сцэне загучэла ў музыцы глыбокая праўда, — было сапраўдным «громам сярод яснага неба». Парыжскія буржуа, «скромныя маці і пачцівыя бацькі», заўсёдашныя наведвальнікі парыжскай оперы былі здзіўлены, абураны і азлоблены. На галаву Бізэ пасыпаліся лаянка і праклёны і опера на першым спектаклі правалілася. Але сіла, закладзеная ў ёй, перамагла. Створаная, каб расказаць аб жыцці народнай масы, «Кармэн» стала адной з самых папулярных для шырокага гледача опер.

Першыя прызнанні яе значнасці і поспеху прышлі праз некалькі год пасля яе стварэння. Ж. Бізэ не ўбачыў пры жыцці гэтага прызнання. Поўны сіл і творчых імкненняў, ён памёр у 1875 годзе, 37 год ад нараджэння, праз тры месяцы пасля першай пастаноўкі оперы. Наш совецкі глядач высока цэніць геніяльнага мастака-рэаліста, чыя опера «Кармэн» з'яўляецца адной з самых любімых оперных пастановак, якія не сходзяць з рэпертуару нашых тэатраў і ўсякі раз прыносяць сапраўдную мастацкую асалоду, хвалююць, напаўняюць здароўем, бадзёрасцю, аптымізмам, радасцю жыцця, што асабліва ярка можа адчуць іменна наш народ — народ вялікай краіны Советаў.

Н. ШЧЭГЛОЎ.

ДА 125-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

На Украіне шырока разгарнулася падрыхтоўка да правядзення 125-й гадавіны з дня нараджэння вернага сына украінскага народа, вялікага паэта - бунтара Тараса Грыгор'евіча Шэўчэнка.

Ва ўсіх абласных цэнтрах створаны спецыяльныя шэўчэнкаўскія камітэты. Юбілейныя камісіі створаны ў многіх сельсоветах і на буйных заводах. У бібліятэках і чырвоных кутках праводзяцца лекцыі на тэму аб жыцці і творчасці Шэўчэнка, наладжваюцца выстаўкі-ілюстрацыі да лекцый і гутарак.

Вялікую работу праводзіць шэўчэнкаўскі камітэт Саюза совецкіх пісьменнікаў Украіны. У прыватнасці, у сталіцы Украіны, на заводах і ў навучальных установах будуць праведзены літаратурныя вечары. На вечары Чырвонацяжнага завода ўступнае слова скажа вядомы украінскі паэт Максім Рыльскі. У вечары прымуць удзел: дэпутат Вярхоўнага Совета УССР акадэмік паэт Паўло Тычына, пісьменнікі А. Капыленка, В. Охрэменка, Д. Гофштэйн, А. Малышка, Л. Вышэслаўскі і Е. Фамін.

І. Стэбун выступіць з уступным словам на шэўчэнкаўскім вечары вагонарамонтнага завода. У правядзенні вечара прымуць удзел пісьменнікі Л. Дмітэрка, С. Скляранка, С. Васкрасенка, В. Сухадольскі, М. Талалаеўскі.

У Кіеўскім дзяржаўным універсітэце на вечары выступіць дэпутат Вярхоўных Советаў СССР і УССР старшыня ўрадавага юбілейнага камітэта Александр Карнейчук. Такі-ж вечар праводзіцца ў сяле Стараселлі — на радзіме руху слаўных пяцісотніц.

Дзяржаўнае літаратурнае выдавецтва Украіны рыхтуецца да выдання твораў вялікага паэта. Тэксты падрыхтоўвае Інстытут літаратуры Акадэміі навук УССР. Работнікі гэтага інстытута тт. Стэбун, Шахоўскі і інш. пішуць папулярныя кніжкі аб жыцці і творчасці паэта - рэволюцыянера.

Дзейсна рыхтуецца да юбілейных дзён Акадэмія навук УССР. Нядаўна на пасяджэнні шэўчэнкаўскай камісіі, якое адбылося пад старшынством неадменнага сакратара Акадэміі навук акадэміка Паладзіна, былі заслуханы паведамленні інстытутаў Акадэміі аб ходзе падрыхтоўкі да юбілею. Акадэмія Навук выдае два тамы твораў паэта, рад навукова - папулярных твораў і два навуковыя зборнікі аб яго жыцці і творчасці.

Будзе склікана спецыяльная сесія Акадэміі навук. Дакладчыкамі на сесіі будуць вучоныя РСФСР, УССР і братніх рэспублік, у прыватнасці тт. Лупол, Вайпінская, Сымон Чыковані і інш.

У шэўчэнкаўскі камітэт Саюза совецкіх пісьменнікаў Украіны прыходзяць шматлікія запросы ад пісьменнікаў братніх рэспублік. Яны просяць выслаць асобныя творы Шэўчэнка з падстрочнікамі для перакладу.

Многія пісьменнікі братніх рэспублік, якія працуюць над перакладамі шэўчэнкаўскіх твораў, самі прыязджаюць у Кіеў, каб атрымаць патрэбныя матэрыялы і дапамогу. Не так даўно на Украіну прыязджалі ленінградскія паэты тт. П. Антакольскі, Н. Браун, А. Камісарава, чувашскі паэт В. Уселі і інш.

7 кастрычніка ў сталіцу Украіны прыехалі ў сувязі з набліжаючымся шэўчэнкаўскім юбілеем вядомыя азербайджанскія паэты — ордэнаносец дэпутат Вярхоўнага Совета Азербайджанскай ССР Рассул Рза і Сулейман Рустам. Першы з'яўляецца членам Усесаюзнага шэўчэнкаўскага камітэта, другі—азербайджанскага. Абодва паэты дэталёва знаёмяцца з работай украінскага юбілейнага камітэта.

Украінскія цэнтральныя, абласныя і раённыя газеты, а таксама і журналы прысвячаюць артыкулы аб жыцці і творчасці вялікага кабзара.

Вс. ГАЛЕНКА.

Нам. адказнага рэдактара **А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.**

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № К—5785.